ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (у дарковым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВ

За радок непр. пасля т... нішагароднія абвесткі—1... Паскрок тэксту—у два разы д... Пры шматразовым друкаванні—скідка. Чэрыз тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбаўкі.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

Москва, Б-ко ЮНК СССР
Объя. СТУДС. СЬПСК

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-86
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Адрэс падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

ПАНЯДЗЕЛАК, 6 кастрычніка 1930 г. № 234 (3832) Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

ГЕНЭРАЛЬНАЯ ПРАВЕРКА ПАЧАЛАСЯ

У БОЙ ЗА БУЛЬБУ!

ВЫКАРЧАВАЦЬ ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНЫ САМАЦЁК

МЕНСК, 6 КАСТРЫЧНІКА

Генэральная праверка пачалася. Паступаюць першыя весткі аб выкананьні плянаў асеньняй с.-г. кампаніі.

Наступіўшыя матар'ялы сыгналізуюць, што на пасеўным фронце карэннага зруху яшчэ няма. Тэмпы сяўбы ганебна марудныя. Калгасы выканалі пасеўны плян толькі на 52 проц. Рэспубліканскі плян сяўбы выкананы менш, чым на 80 проц.

Час, на працягу якога яшчэ можна праводзіць сяўбу, вымяраецца літаральна некалькімі днямі. Нельга траціць ні адной хвіліны. **Прарыў павінен быць ліквідаваны.** Без усякай літасьці трэба вырываць найменшыя спробы апраўдаць агідныя тэмпы сяўбы «абектыўнымі» прычынамі. Уся справа тут у тым, што рад раённых арганізацый стаіць у глыбокім тылу асеньняй сяўбы. Карэнандэцыя з Юравіцкага раёну—яркая ілюстрацыя. Тут правыя апартуністы з раённага кіраўніцтва зрываюць асеньнюю сяўбу і тармозяць калгасны рух.

Посьпехі калгасаў «Расьсьвет—Пераможца» і «Новы Шлях», якія па-бальшавіцку скончылі асеньнюю сяўбу, напырыўны азімы клін, добра паказваюць чаго можна дасягнуць пры сапраўды ўдарных тэмпах работы. Прычына перамогі гэтых калгасаў заключаецца ў выразнай **арганізацыі працы, у разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, у правільных узаемаадносінах з адзіноасобнікамі.** На перадавікох бальшавіцкай сяўбы павінны зараз-жа падтрэўняцца ўсе калгасы і саўгасы БССР.

Плян сяўбы зусім рэальны. Трэба толькі з яшчэ большай жорсткасьцю ўдарыць па ўсякай праваапартуністычнай бязьдзейнасьці і самацёку. Трэба правільна выкарыстаць усе наяўныя сілы, выразна арганізаваць працу, разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва.

Першы дзень генэральнай праверкі сыгналізуе аб пагражаючым становішчы з уборкай і адгрузкай бульбы. На сёнешні дзень калгасы БССР выканалі **ня больш 20 проц. пляну ўборкі бульбы. Замест 400** вагонаў, якія трэба адгружаць кожны дзень, адгружаецца толькі некалькі дзесяткаў. Месцы, загатоўчыя арганізацыі не мабілізаваліся на баявое правядзеньне ўборкі і адгрузкі бульбы. Пануюць злачынна павольныя тэмпы, самацёк, неарганізаванасьць.

Няправільна і шкодна тлумачыць нікуды няварытыя тэмпы ўборкі толькі недахватам рабочай сілы ў калгасах. Корань зла—**у адсутнасьці арганізацыі працы,** у няправільным, нерацыянальным, а часамі проста злачынным выкарыстоўваньні наяўнай рабочай сілы.

Работа часта ідзе самацёкам. Месцы енчаць аб недахваце рабочай сілы, а ў цэлым радзе калгасаў калгасная маса, асабліва жанчыны, ня прыцягнуты да ўборкі. Многія раённыя арганізацыі з рук вон дрэнна правялі арганізацыйную і растлумачальную работу, зьвязаную з уборкай і адгрузкай бульбы.

Прымітыўная падзеншчына, якая ўсё яшчэ ёсьць у частцы калгасаў,—вялізарнейшая перашкода баявым тэмпам уборкі. Яна тармозіць прадукцыйнасьць працы і ў цэлым радзе выпадкаў выклікае незацікаўленасьць калгасьнікаў ва ўборцы. У некаторых раёнах калгасы яшчэ не разьмеркавалі ўраджай, калгасьнікі яшчэ не азнаёмлены з прынцыпамі разьмеркаваньня, яны яшчэ зусім не ведаюць, што ім дасьць калгас. Гэтым карыстаецца кулацтва, якое прабуе дэзарганізаваць уборку.

Зараз-жа даб'емся рашаючага пералому ва ўборцы бульбы. За суровую плянавасьць і баявую выразную арганізаванасьць уборачных работ. Трэба неадкладна правільна расставіць усе чаяўныя сілы ў калгасах, забясьпечыўшы максымальна выразную арганізацыю працы. Трэба забясьпечыць рацыянальнае выкарыстоўваньне рабочых і прафсаюзных брыгад, накіраваных на ўборку бульбы. У адстаючых калгасах і саўгасах неадкладна стварыць ударныя брыгады. Не дапускаць ніякага самацёку, ніякай неарганізаванасьці ва ўборцы і адгрузцы. Давець самы **бязьлітасны, руйнуючы адпор спробам кулацтва дэзарганізаваць уборачны фронт. Апартуністых, якія кулаку на выгаду тармозяць уборку, зрываюць пляны загатовак і адгрузкі бульбы, зьнімаць з работы, прыцягваць да самай суровай адказнасьці.**

Усе сілы, усю нашу энэргію, волю, настойлівасьць мабілізуем на карэнную ліквідацыю прарываў да дня ўраджаю. Арганізуем масы калгасьнікаў, рабочых саўгасаў, адзіноасобнікаў—беднякоў і сераднякоў на змаганьне за бульбу.

Ня гледзячы ні на якія перашкоды, мы павінны поўнасьцю ўбраць і загатовіць бульбу, выканаць плян адгрузкі. Гэта баявая ўдарная задача павінна быць выканана. **БУЛЬБА БУДЗЕ УБРАНА. БУЛЬБА БУДЗЕ АДГРУЖАНА.**

УБОРКА—У НЕБЯСЬПЕЦЫ

КАЛГАСЫ ВЫКАНАЛІ 20% ПЛЯНУ

ВЫРАЎНЯЦЬ УБОРАЧНЫ ФРОНТ

АДГРУЗІЦЬ 160.000 ТОН ДА 20 КАСТРЫЧНІКА

ВЫРАЗНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ ДАСЬЦЬ ПЕРАМОГУ

Усю энэргію, усе сілы грамадзкасьці—на бульбазагатоўкі

Тэлеграма ЦК КП(б)Б і СНК

— Ня гледзячы на дырэктывы аб паданьні справе загатовак і адгрузкі бульбы ўдарных тэмпаў, да гэтага часу загатоўкі ідуць злачынна марудна. Пляны загатовак бульбы ў верасьні выкананы ў вельмі ганебным проценце. Нарады на выраз ня выкананы.

На працягу кастрычніка ў асноўныя прамысловыя цэнтры Саюзу павінна быць вывезена 160 тысяч тон бульбы. Гэта патрабуе напружанасьці, улады і ўсёй грамадзкасьці. Кожны дзень з Беларусі павінна адгружацца 400 вагонаў бульбы. Аднак, месцы ня здолелі прыцягнуць членаў партыі, членаў прафсаюзаў, бядняцка-серадняцкія масы, жонак рабочых і служачых на дапамогу ўборцы бульбы.

Загатоўчыя арганізацыі бязьдзейнічаюць, чакаюць самацёку.

Такія адносіны гавораць аб самай шкодным недаацэнцы задачы і пагражаюць зрывам выкананьня плянаў загатоўкі і вывазу.

Зараз-жа ўсёй справе бульба-загатовак і адгрузкі павінны быць паданы рашучыя, сапраўды баявыя тэмпы.

Пад асабістую адказнасьць сакратароў райкомаў, старшыень райвыканкомаў трэба ўжыць наступныя меры: зараз-жа зьвязацца з усімі калгасамі і саўгасамі, выявіць патрэбную рабочую сілу, мабілізаваць масы і кінуць іх на дапамогу капаньню бульбы.

Кулацкія гаспадаркам павінны быць даны кароткія тэрміны здачы бульбы дзяржаве. Трэба прыняць рашучыя меры супроць тых, хто не здае бульбы.

Нядзольныя працаваць у загатоўчых арганізацыях павінны быць зьняты з работы і замешаны больш здольнымі работнікамі. Трэба ўзмацніць загатоўчыя арганізацыі да канца кампаніі новымі сіламі. Трэба мабілізаваць адказных работнікаў і накіраваць іх у калгасы і саўгасы для арганізацыі справы на месцы.

Ухараніць у работе на загатоўках і адгрузцы бульбы мэтады ўдарніцтва і спаборніцтва, арганізацыі чырвоных абозаў.

Побач з выкананьнем нарадаў па выраз, неабходна ўжыць усе захады па вызначэньні зон для прамысловасьці, для бесперабойнай загрузкі заводаў бульбай. Трэба пакласьці канец тэндэцыям месьціць загатоўчыя пляны.

Даныя пляны павінны быць прынятыя да выкананьня і разьмеркаваны па сёлах, калгасах, саўгасах і кулацкіх гаспадарках.

Усю работу па бульбазагатоўках трэба ўзяць пад жорсткі кантроль рабочых брыгад.

Тэндэцыі месьціцца павінны быць ліквідаваны.

Папярэджваем, што зрыў пляну загатовак паасобнымі раёнамі, невыкананьне нарадаў на выраз будуць разглядацца, як невыкананьне галоўнейшых гаспадарча-палітычных кампаній.

За сакратара ЦК КП(б)Б СЯНКЕВІЧ.

Намесьнік старшыні СНК БССР Калнін.

Брыгада вучняў сямігодкі — на ўборцы бульбы ў нурэйскім калгасе «Новае Жыцьцё».

200 тысяч руб. прамтаварамі—на прэміяваньне за ўборку

Пастанова эканамічнай нарады пры СНК БССР

У разьвіцьцё пастановы Савету Народных Камісараў БССР ад 3 кастрычніка г. г. «Пра ход загатоўкі і адгрузкі бульбы» (апублікаванай у газэце «Савецкая Беларусь» № 231 за 4 кастрычніка 1930 г.), Эканамічная Нарада БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Гандлю выдзеліць фонд з прамтавараў на суму да 200 тыс. рублёў для прэміяваньня рабочае сілы, якая спэцыяльна на набіраецца савецкімі і калектыўнымі гаспадаркамі для капаньня бульбы.

2. Прэміяваньне рабіць у разьмеры 20 проц. агульнай сумы, што выплачваецца выключна наёмнай рабочай сіле за капаньне бульбы, паводле сьпісаў, складзеных кіраўнікамі савецкіх гаспадарак і кіраўніцтвамі калгасаў, на якіх ускладаецца адказнасьць за правільнае складаньне гэтых сьпісаў.

3. Да атрыманьня з саюзных рэсурсаў памянёных у арт. 1 фондаў, прапанаваць Наркамгандлю і Белкаапсаюзу забясьпечыць безадкладную выдачу гэтых фондаў з наяўных рэсурсаў. Даручыць Белкаапсаюзу, з прыцягненьнем Белкалгасцэнтру і Белсельтэрсту на працягу 24-х гадзін разьмеркаваць гэты фонд па раёнах і спажывецкіх таварыствах.

4. Прапанаваць Наркамгандлю і Белкаапсаюзу тэрмінова ўзьняць у саюзных органах пытаньне аб прыраўнаньні тэрміну адгрузкі да... БССР прамтавараў на прэміяваньне здэтчыкаў бульбы да тэрміну адгрузкі... тых тавараў у асноўныя збожжазагатоўчыя раёны Саюзу ССР.

5. Забараніць раённым выканаўчым камітэтам перагляд плянаў бульбазагатовак у бок іх памяншэньня.

6. Адзначаючы, што некаторыя раённыя выканаўчыя камітэты абмяжоўваюць дзейнасьць спажывецкай кааперацыі ў галіне загатоўкі бульбы праз вызначэньне для яе некаторай колькасьці сельсаветаў, прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам скасаваць усякія абмежаваньні ў рабоце спажывецкай кааперацыі, апроч работы ў прызаводкай зоне, якая ўстанаўляецца ў поўнай адпаведнасьці з інструкцыяй Наркамгандлю.

7. Пацьвердзіць ранейшую пастанову ЭКАНА аб устанаўленьні дзьвёх цэн на бульбу: на сталовую бульбу 3 р. 60 к. і тэхнічную—3 р. 12 к. за цэнтнар.

Час. в. аб. Старшыні Эканамічнае Нарады БССР А. КАЛНІН.

Нам. кіраўніцтва спраў СНК і Экана БССР ДУБАВІЦКІ.

НЕ ЧАКАЦЬ ЗАМАРАЗКАЎ

Учора Белплодагародніна атрымала тэлеграму наступнага зьместу:

«Паводле атрыманых вестак, у порыў 20-25 кастрычніка на ўсёй эўрапэйскай частцы СССР прапясецца халодны цыклён. У сувязі з гэтым прапануецца прыняць самыя рашучыя меры да максымальнай адгрузкі бульбы да 20-га кастрычніка.

Асаблівую ўвагу зварачаем на ўзмацненьне адгрузкі ў паўночныя і усходнія раёны СССР.

Асобна-упаўнаважаны Савету Працы і Абароны —ЧУХРЫТА.

8.000 тон бульбы ня ўбрана з поля

БЫХАЎ. (Наш кар.). На 3 кастрычніка на палёх саўгасаў і калгасаў Быхаўскага раёну ня ўбрана яшчэ звыш 8.000 тон бульбы.

Улічваючы пагражаючае становішча з уборкай, бухарскія райком КП(б)Б і райвыканком арганізавалі надзвычайную пяцёрку па ўборцы бульбы. Пяцёрка распрацавала рад рашучых мер да правядзеньня ўборкі.

Арганізаваны сходы, мітынгі на ўсіх установах, на якіх завострана ўвага на пытаньні аб неадкладнай дапамозе калгасам.

Асноўная маса служачых раённых устаноў мабілізавана на 5 дзён у саўгасы. Рабочая прадпрыемствам арганізоўваюць дапамогу ў выхадныя дні.

Перашкаджае ўборцы адсутнасьць дзіцячых яслёў у большасьці калгасаў.—жанчыны ня могуць адарвацца ад хаты і пайсьці на поле.

У некаторых калгасах («Новы Сьвет») яслі не забясьпечаны абсталяваньнем і знаходзяцца ў антысанітарных умовах.

Ёсьць выпадкі дрэннага выкарыстаньня пасланых брыгад.

Ад правільнага скарыстаньня тых сродкаў працоўных, якія ідуць дапамагаць уборцы ва многім залежыць посьпех кампаніі. Трэба сярод калгасьнікаў шырэй разгарнуць сацыяпаборніцтва на лепшую ўборку. Калгасьнікі і рабочыя саўгасаў павінны паказаць прыклад працоўнай дысцыпліны. Жанчыны-калгасьніцы с.-г. арцелі «Новы Сьвет» паказалі ўдарныя тэмпы работы—35 жанчын за 2 дні ўбралі 4 га. З іх павінны ўзяць прыклад калгасьніцы рацёну. К—ў.

На мёртвым пункце

У кастрычніку па БССР павінна быць загатоўлена 320.000 тон бульбы, з якіх 160.000 тон павінна быць вывезена для забясьпячэньня пралетарскіх цэнтраў Саюзу.

На працягу кастрычніка трэба вывезьці ў Маскву 25.000 тон, у Ленінград—57.000 тон., на Украіну—35.000 тон. Каўказ—13.000 тон і ў паўночныя раёны—30.000 тон.

Выкананьне гэтага пляну патрабуе напружаньня ўсіх сіл партыйных, прафэсыянальных і камсамольскіх арганізацый.

Між тым, на сёнешні дзень, ня гледзячы на ўсе дырэктывы Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б, Саўнаркому і ЦСПСБ, адгрузка бульбы праходзіць вельмі слаба. Штодзенна адгружаецца ня больш 120 вагонаў, што зьяўляецца вельмі невыстарчальным. Для таго, каб выканаць толькі плян вывазу неабходна штодзенна адгружаць па менш 400 вагонаў.

Асабліва дрэнна праходзіць адгрузка ў паўночныя раёны. Адгрузка бульбы ў гэтыя раёны павінна быць скончана да 10-га кастрычніка з прычыны наступленьня халадоў на поўначы. Між тым на сёнешні дзень яшчэ ня прыступлена да адгрузкі бульбы на поўнач.

Масавая ўборка бульбы яшчэ не разгорнута. На мясцох яшчэ ня здолелі ўзьняць бядняцка-серадняцкія масы, калгасьнікаў, батрацтва, членаў прафсаюзаў, камсамол на капаньне бульбы, на дастаўку яе да чыгункі.

З раду месц прыходзяць весткі, што разгортваньне адгрузкі бульбы затрымліваецца з-за адсутнасьці патрэбнай тары. На мясцох нічога ня зроблена для мабілізацыі тары як у гандлёвых арганізацыях, так і сярод насельніцтва.

РЫХТАВАЦЦА

да „ДНЯ УРАДЖАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ“

„Расьсьвет-Пераможца“ і „Новы шлях“ ідуць наперадзе

Узмацняйце калгасны прыбой. Мацней удар па кулаку, па правых і „левых“ апартуністых

14 кастрычніка НА ПАРОЗЕ,

аднак, падрыхтоўка да „дня ўраджаю і калектывізацыі“ зусім не разгорнута

Саюз с.-г. рабочых і ЦСПСБ—у тылу

Учора пры ЦК КП(б)Б адбылася нарада па пытаньнях ПАДРЫХТОЎКІ ДА ДНЯ ЎРАДЖАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. Нарада паказала, што большасьць цэнтральных арганізацый да сёнешняга дня не разгарнула канкрэтнай падрыхтоўкі. У прыватнасьці, зусім НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА рыхтуецца да дня ўраджаю і калектывізацыі ЦСПСБ і САЮЗ С.-Г. РАБОЧЫХ. ЦСПСБ да гэтага часу ня прыняў рашучых мер па мабілізацыі прафсаюзаў на падрыхтоўку да дня ўраджаю. Рэспубліканскі камітэт саюзу с.-г. рабочых нічога ня ведае, як месцы рыхтуюцца да дня ўраджаю і калектывізацыі.

ЦК камсамолу арганізуе да гэтага дня ўсебеларускае сьвяткаводную эстафэту. Але пакуль на практыцы зроблена яшчэ ЗУСІМ МАЛА. Многія раённыя арганізацыі ня прынялі ніякага ўдзелу ў эстафэце.

ЦК КП(б)Б яшчэ ў пачатку верасьня даў зусім выразныя дырэктывы аб падрыхтоўцы да дня ўраджаю і калектывізацыі. Але гэтыя дырэктывы ЯШЧЭ НЯ ВЫКАНАНЫ. Белкаапсаюз, напрыклад, ня толькі НЕ ПРАВОДЗІЦЬ практычнай падрыхтоўкі, але навет НЯ ДАЎ мясцом дырэктыўных паказаньняў да дня ўраджаю і калектывізацыі. Каб апраўдаць гэту ганебную бязьдзейнасьць, прадстаўнік Белкаапсаюзу ўпарта спасылаўся на «абектыўныя» прычыны. У іх, бачыце, няма вольных людзей для правядзеньня падрыхтоўчай работы і т. д.

Наркамасьветы БССР ТОЛЬКІ ЗАРАЗ стаў распрацоўваць дырэктыўны ліст аб правядзеньні дня ўраджаю і калектывізацыі. Вельмі паказальна, што і па сёнешні дзень гэты ліст НЕ РАСПРАЦАВАНЫ.

НКЗ БССР і Белкалгасцэнтр, якія ў першую чаргу павінны прыняць самы актыўнейшы ўдзел у правядзеньні дня ўраджаю, навет на прыспалі сваіх прадстаўнікоў на нараду.

Нарада падкрэсьліла недапушчальнасьць такіх тэмпаў падрыхтоўкі і выпрацавала рад мерапрыемстваў па разгортваньні падрыхтоўчай работы.

АПАРТУНІСТЫЯ З ПАСТОЎ НЯ ЗЬНЯТЫ

ЮРАВІЦКІ РК ПРЫМІРЭНЧА АДНОСІЦЦА ДА КУЛАЦКАЙ АГЕНТУРЫ

ЮРАВІЧЫ. (Наш кар.). Падаўна «Зьвязда» паведамляла, што апартуністычнае кіраўніцтва райсаўгасаюзу зрывае асеньнюю с.-г. кампанію. Сыгналізуем, што становішча не зьмянілася. Апартуністы з пастоў ня зьняты. Партыйная арганізацыя не мабілізавала на ліквідацыю прарываў.

Калгасы паранейшаму недапушчальна адстаюць у сяўбе, выканаўшы пляны толькі на 56 проц. Паасобныя калгасы да 1 кастрычніка навет не прыступілі да сяўбы. Прычына — адсутнасьць насеньня. Жыта не абмалочана. Малатарні і трактары выкарыстоўваюцца злачынна. Ачыстка насеньня праведена толькі на 65 проц. Райза займаецца простым ашуканствам, зазіўляючы бяз усякіх падстаў, што пляны азімстві выкананы на 86 проц.

Райза паведамляе, што абмен гатунковага насеньня праведзены на 113 проц., але гэта агідная хлусьня. Цэлы рад пунктаў зусім ня мяюць гатунковага насеньня. Паводле афіцыйных вестак райза, калгасы ўбралі ўсе 100 проц. траў. У сапраўднасьці-ж калгасы да сёнешняга дня не скасілі 300 га траў. Весткі райза аб ходзе сяўбы і ўборкі зьяўляюцца, такім чынам, нічым іншым, як «очковтирательством».

Райкалгасаюз і райза паранейшаму знаходзяцца ў палоне праваапартуністычнага самацёку. Старшыня райкалгасаюзу Якуновіч, зьняты з працы за праваапартуністычную практыку, і да гэтага часу зьяўляецца старшынёю райкалгасаюзу. Раённыя арганізацыі не даюць патрэбнага адпору спробам кулацтва разваліць калгасы. Змаганьне з кулацтвам у раёне зусім паслаблена. Патрабуем неадкладна зьняць праваапартуністычнае кіраўніцтва райкалгасаюзу і райза. Новы РК КП(б)Б павінен ударыць па кулацкай агентуры, якая арганізуе калгаснае будаўніцтва ў раёне. М—к.

СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН

поўнасьцю выкананы

АЗАРЫЧЫ, 5. Калгас «НОВЫ ШЛЯХ», Асташкаўскага сельсавету, дасягнуў ударных тэмпаў у правядзеньні асеньняй с.-г. кампаніі. Сустрэчным калгасным плянам «Новы Шлях» павялічыў пасеўную плошчу на 15 га. Сустрэчны плян ВЫКАНАНЫ НА УСЕ 100 ПРОЦ. да 1 кастрычніка. У часе асеньняй сяўбы ў калгас уступіла 6 адзіноасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Зараз калгас па-баявому выконвае загатоўчыя пляны. «Новы Шлях» ужо здаў каля 60 тон бульбы. Усяго калгас здасьць звыш 100 тон.

Кантрольнае заданьне па збожжазагатоўках калгасьнікі павялічылі сустрэчным пляном больш чым у 2½ разы.

Калгасьнік П.

БЮЛЕТЭНЬ № 1

Ход асеньняй сяўбы паранейшаму застаецца зусім незадавальняючым. На сёнешні дзень плян сяўбы выкананы ня больш, як на 80 проц. Калгасы ўсё яшчэ значна адстаюць. Яны выканалі толькі каля 60 проц. заданьня.

Засталося некалькі лічаных дзён, па працягу якіх яшчэ можна праводзіць сяўбу. Між тым, значная частка калгасаў і райарганізацый ня ўжыла належных мер, каб неадкладна выканаць пасеўны плян.

Адзначаем перадавыя калгасы «Расьсьвет—Пераможца» (Жлобінскі раён) і «Новы Шлях» (Азарычкі раён), якія, дзякуючы сацспаборніцтву і ўдарніцтву і добрай арганізацыі працы, перавыканалі пасеўныя пляны. У выніку ў арцель «Расьсьвет—Пераможца» зараз ужо ўступіла 10 новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і ў калгас «Новы Шлях»—6.

Самым пагражаючым вучасткам застаецца ўборка бульбы і адгрузка яе ў пралетарскія цэнтры СССР. Недапушчальна адстаюць калгасы, якія да гэтага часу выканалі ня больш 20 проц. пляну ўборкі. Ва ўборцы бульбы пакуль не дасягнута ніякага зруху.

Становішча з адгрузкай бульбы характарызуецца наступнымі данымі: не пазьней, як да 20 кастрычніка павінна быць адгружана 160.000 тон—штодзенна 400 вагонаў. Адгружаецца-ж толькі некалькі дзесяткаў вагонаў. Загатоўчыя арганізацыі бязьдзейнічаюць. Мясцовыя органы ня ўжываюць рашучых мер да фарсаваньня тэмпаў адгрузкі.

„Расьсьвет—Пераможца“ СКОНЧЫЎ СЯЎБУ І ЎБОРКУ БУЛЬБЫ

НОВЫ ПРЫЛІЎ У КАЛГАС

ЖЛОБІН. (Брыгада «Зьвязды»). Перадавыя калгасы Жлобінскага раёну рыхтуюцца да дня ўраджаю і калектывізацыі. Калгасьнікі на сваіх агульных сходах прапрацоўваюць адозву ЦК УсеКП(б), прымаючы практычныя меры да яе рэалізацыі. Калгас «РАСЬСЬВЕТ—ПЕРАМОЖЦА», паставіўшы сваёй мэтай ліквідаваць усе прарывы да дня ўраджаю і калектывізацыі, да 1 кастрычніка поўнасьцю выканаў пасеўны плян. Азімы клін ПАШЫРАНЫ НА 10 ГЭКТАР. КАЛГАС ПАБАЛЬШАВІЦКУ ВЫКАНАЎ ПЛЯН УБОРКІ БУЛЬБЫ. Уся бульба была ўбрана да ўсесаюзнага дня ўдарніка. «Расьсьвет—Пераможца» выклікаў сваіх суседзяй-адзіноасобнікаў на сацыялістычнае спаборніцтва па ўборцы бульбы. У адказ адзіноасобнікі стварылі ўдарныя брыгады па 20 чалавек, якія праводзілі ўборку бульбы.

Цяпер адзіноасобнікі заяўляюць калгасьнікам арцелі «Расьсьвет—Пераможца»:

— Мы ў вас навучыліся як працаваць па-ўдарнаму.

У гарадзкі і падрыхтоўкай да дня ўраджаю і калектывізацыі ў калгас «Расьсьвет — Пераможца» сталі паступаць заявы аб прыёме. У КАЛГАС УЖО ПАСТУПІЛА 10 АДЗІНААСОБНЫХ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

Разгортваючы практычную падрыхтоўку да дня ўраджаю і калектывізацыі, калгас «Расьсьвет—Пераможца» выпрацаваў свой сустрэчны вытворча-фінансавы калгасны плян. Створаны пляновыя калгасныя групы. Арганізаваны групы па паляводзтве, жывёлагадоўлі, агародніцтве, будаўніцтве, пчалярстве і г. д. Г—ў.

Жлобінскі РВК яшчэ дагэтуль не адвёў азімага кліну

Тэмпы ўборкі ў Жлобінскім раёне вельмі незадавальняючыя. Пералому ўсё яшчэ няма. На 1 кастрычніка заданьне пасеву ў калгасах выканана ўсяго толькі на 30 проц. — замест 3.150 гэкт. засеяна толькі 945 гэкт.

Ёсьць яшчэ і такія калгасы, якія ня скончылі ўборкі. Калгас «На варце» ня ўбраў 17 гэкт. сенажаці, калгас «Чырвоны Жлобін» ня ўбраў грэчкі і г. д.

Калгасу «На Варце» да гэтага часу яшчэ не адведзены азімы клін. Райвыканком матывуе гэта тым, што, маў, няма дзе адвесьці клін. Б.

Пасяджэньне штабу праверкі

Учора пры «Зьвязьдзе» адбылося першае пасяджэньне штабу па правядзеньні генэральнай праверкі з удзелам прадстаўнікоў раду сельска-гаспадарчых арганізацый.

Абмяркоўвалася пытаньне аб прыцягненьні адказных работнікаў арганізацый, якія камандыраваны ў вёску, да актыўнага ўдзелу ў праверцы на мясцох, і правядзеньні «дня ўраджаю і калектывізацыі». Штаб выказаўся за затрыманьне мабілізаваных адказных работнікаў да канца праверкі на мясцох з тым, каб пераключыць іх на работу па праверцы. Работнікі павінны падтрымліваць самую цесную сувязь з усебеларускім штабам.

Штаб знайшоў неабходным, каб зацікаўленыя арганізацыі ў бліжэйшыя-ж дні вызначылі фонды прэміяваньня лепшых калгасаў, саўгасаў, ударнікаў — саўгасьнікаў, калгасьнікаў, 25-тысячнікаў.

АБВЯШЧАЕМ СЯБЕ ЎДАРНЫМІ

СЬМІЛАВІЧЫ. Калгасы і адзіноасобнікі Сьмілавіцкага раёну адазваліся ўсесаюзнаму дню ударніка арганізаваньнем здачы бульбы і абожжа. У гэты дзень здана 177 тон бульбы і 37½ тон збожжа. Саўгасы «СЕРП», «ЗЬВЯЗДА» і калгас імя XVI зьезду УсеКП(б) абвясьцілі сябе ўдарнымі і абавязаліся дэтэрмінова ўбраць усю бульбу. Паасобныя калгасы і саўгасы ў гэты дзень прэміравалі сваіх лепшых ударнікаў. У калгасе «Прафінтэрн», напрыклад, прэміявана 20 лепшых калгасьнікаў-ударнікаў, у саўгасе «Серп»—7 ударнікаў і г. д.

У калгасы «Рабочы» і «Новы сьвет» уступіла 8 адзіноасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Сяляне ўступаюць у калгасы

У Журавіцкім раёне была праведзена растлумачальная работа сярод сялян аб выгаднасьці калектыўнае гаспадаркі, у выніку чаго мы маем прыліў у калгасы. У калгас «Ленінская ніва» ўступілі 32 двары, у «Іскру»—9 двароў. Ужо абагулена масавасьць і праведзена зямляўпарадкаваньне кожных гаспадарак. Плошча калгасаў пашырылася на 300 га.

Калгасы добра спраўліліся з уборкай ураджаю і дапамагчы некаторым адзіноасобнікам скончыць уборку.

ШАБЛОЎСКІ.

СОРАМ І ГАНЬБА ІМ!

Наступныя раёны злачынна адстаюць у асеньняй пасеўнай кампаніі. Грэскі (33,4 проц. пасеўнага пляну); Гарадоцкі (35,1 проц.); Тураўскі (22,8 проц.); Каралінскі (48,7 проц.); Капыткевіцкі (45,4 проц.); Пуховіцкі (48 проц.); Любаньскі (52,6 проц.); Крупскі (52 проц.); Лоеўскі (56 проц.).

На лініі найменшага супраціўленьня

Спыніць канкурэнцыю бульбазагатоўцаў

У рэдакцыю «Зьвязды» зьвярнулася рабочая брыгада заводу «Чырвоны Бераг» з просьбай дапамагчы рабочым зьнішчыць непаладкі, якія перашкаджаюць зрывам работ.

Для забясьпячэньня сыроцэ—бульбай крухмальнага заводу «Чырвоны Бераг» была вызначана спэцыяльная зона з некалькіх сельсаветаў.

Аднак, мясцовыя загатоўчыя арганізацыі, выконваючы тэлеграму тав. Галадзеда аб узмацненьні адгрузкі бульбы ў Ленінград, пайшлі на лініі найменшага супраціўленьня і адгружаюць бульбу з раёнаў, якія вызначаны для забясьпячэньня заводу.

Загатоўчыя арганізацыі перанімаюць чырвоныя абозы, арганізаваныя рабочымі брыгадамі заводу «Чырвоны Бераг». Тым сялянам, якія не вазуць бульбы на завод, а едуць на Ленінград, выдаецца прэмія махоркай і крамтаварамі, чым зрываецца плян загатовак.

Прысуд над віноўнікамі крушэньня на ст. Пярэрва

Пасьля шасьцігадзіннага нарады суд вынес прыгавор віноўнікам крушэньня на станцыі Пярэрва. Галоўныя абвінавачаныя Чарэнкоў і Новікаў прыгавораны да 10 год пазбаўленьня волі з параўнаньнем у правах на 3 гады. Машыністы Макараў — на 8 год пазбаўленьня волі, з адбыцьцём кары ў папраўчых лагерах, Якупаў — на 3 год з параўнаньнем у правах на 2 гады, Захараў, нам. майстра дэпо Чуды — на 3 гады пазбаўленьня волі, нач. шашнэйстага цэнтра № 52, Харытонаў — на 2 гады, галоўны кандуктар цягніка № 64, Сазельпеў—да адзнакі пазбаўленьня волі.

Харытонаў і Сазельпеў абгрунтаваны ўмоўна. Харытонаў з-пад варты вызвалены. Суд пастанавіў закрыць тавр, прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці рад адказных работнікаў Маскоўска-Курскай чыгункі.

На барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры

За Савецкую Польшчу

Адозва

Камуністычнай партыі Польшчы да працоўных мас Польшчы, Зах. Украіны і Зах. Беларусі

У зьвязку з наближэньнем соймавых выбараў у Польшчы Цэнтральны Камітэт кампартыі Польшчы зьвяртаўся да працоўных мас з адозвай, у якой дае дакладную характарыстыку сучаснага гаспадарчага і палітычнага становішча краю.

«Крывавая фашысцкая дыктатура Пілсудзкага, — пачынаецца адозва, — назначыла новыя выбары ў сойм. Ва ўмовах фашысцкай дыктатуры расьпісаньне выбараў у сойм мае на мэце скрыць перад працоўнымі масамі сапраўдныя мэты фашызму, адцягваючы рабочых, сялян і салдат ад сапраўднай барацьбы за зьвяржэньне фашысцкай дыктатуры, за дыктатуру пралетарыяту, за савецкую Польшчу. Пілсудскі назначыў выбары ў сойм, каб адхіліць увагу мас ад непасрэднай барацьбы за хлеб, за працу, за зямлю, за самавызначэньне паняволеных народаў аж да аддзяленьня, каб адхіліць увагу ад ваенных падрыхтаваньняў да нападу на СССР. Але пры сучасным гаспадарчым і палітычным становішчы Польшчы гэтыя сродкі не дасягнуць мэты.

«Прапічыцца стары грабежнік рабочых і сялян, — гаворыцца далей у адозьве. — Прапічацца таксама розныя Дашынскія, Вітасы, Багінскія і Путкі, якія са сноўды пазуць, каб выратаваць фашысцкую дыктатуру.

Ніхто ня можа ўжо зараз скрыць таго факту, што фашысцкі блёк знаходзіцца зараз у стане глыбокага развалу і распаду, што фашысцкія ўрады даслалі край да гаспадарчага зруйнаваньня, кінулі самыя шырокія працоўныя масы гарадоў і вёсак на дно самай страшнай галечы і прыгнечаньня. **Вычарпалася цярпеньне працоўных мас! Чым далей, тым усё больш грозным становіцца абурэньне мас, усё больш часта і магутна выступаюць на вуліцу рабочыя і сяляне з патрабаваньнем: працы, хлеба і зямлі.** Працоўныя масы досыць напярпеліся за час 12-гадовага кіраўніцтва ўрадаў буржуазіі, 4-гадовага кіраўніцтва фашысцкай дыктатуры, ураду голаду, беспрацоўя, белага тэрору і вайны. Вялізарная армія беспрацоўных і напалову беспрацоўных, узмоцненая эксплёатацыя прамысловых і сельска-гаспадарчых рабочых, страшэнны голад бязрольнага і малазрольнага сялянства на зямлю, падаткоўны грабёж шырокіх працоўных мас, узмацняючыся тэрор паліцыі і фашысцкіх бандаў, кулі — замест хлеба, турма — замест працы, дзікае прыгнечаньне нацыянальных фашысцкімі сатрапамі на акупаваных землях, ліхаманкавае падрыхтаваньне да ўзброенага нападу на СССР і штодзённыя антысавецкія ваенныя правакацыі — вось сумны малюнак фашысцкай Польшчы, якое — у імя і інтарэсаў вялікага капіталу, фабрыкантаў, банкіраў, памешчыкаў і кулакоў — кіруе разьюшаная генэральская банда з крывавым Пілсудзкім на чале.

«Што раз мацней рвуць ланцугі польскай акупацыі працоўныя Зах. Украіны і Зах. Беларусі. Працоўныя масы Зах. Украіны і Зах. Беларусі ўсё больш усьведамляюць, што толькі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі могуць выйсьці яны з пекла сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечаньня. У часе дадатковых выбараў у Ковелі і Лідзе, дзе сьпісы антыфашысцкага блёку атрымалі вялікую перамогу, украінскія і беларускія працоўныя масы давялі, што яны ў рэвалюцыйных рэдох супольна з пралетарыятам Польшчы змагаюцца супроць фашызму і акупацыі. Баявымі дэманстрацыямі (Санок, Алекшыцы) украінскія і беларускія рабочыя і сяляне ўсё больш часта пацьвярджаюць цьвёрдую волю да барацьбы за зьвяржэньне фашысцкай дыктатуры. Украінскія і беларускія сяляне пускаюць з дымам маёнткі памешчыкаў і асаднікаў-польскіх казакоў. Вызваленчая барацьба працоўных мас Зах. Украіны і Зах. Беларусі зьяўляецца барацьбой усяго польскага пралетарыяту. **Польскі пралетарыят можа сам парваць панцугі клясавага прыгнечаньня толькі тады, калі злучыць сваю барацьбу супроць польскай буржуазіі з вызваленчай барацьбой працоўных мас Зах. Украіны і Зах. Беларусі супроць польскай акупацыі, за самавызначэньне аж ад аддзяленьня і далучэньня Зах. Украіны і Зах. Беларусі да брацкіх савецкіх рэспублік.**

Адозва далей паказвае працоўным масам, што:

«Перамога ў барацьбе са сьмяротным клясавым ворагам залежыць ад вас самых ад вашага разрыву са здрадніцкімі правадырамі і далучэньнем да вялікага антыфашысцкага блёку рабочых, сялян і падняволеных народаў. Ваш лёс, лёс вашых сем'яў знаходзіцца ў вашых руках. Толькі мы, камуністы, паказваем рабоча-сялянскім масам адзіную дарогу вызваленьня — бязьлітасную клясавую барацьбу супроць беспрацоўя, супроць лёкаўтаў, супроць забойчай капіталістычнай рацыяналізацыі, супроць дзікай эксплёатацыі працоўных жанчын і малалетніх, супроць сацыял-фашысцкага і фашысцкага арбітражу, які душыць забастовачную барацьбу, супроць шарварачнага прыгону, супроць зьдзекаў над батракамі і сялянскай беднатой, супроць падатковых і вайсковых цяжкасьцяй, супроць эксплёатацыі дома-ўласьнікаў і багатых купцоў. Толькі мы, камуністы, паказваем вам адзіную рэвалюцыйнае вырашэньне крызісу: зьвяржэньне панаваньня капіталу шляхам узброенага паўстаньня рабочых, сялян і салдат і стварэньне рабоча-сялянскага ўраду, ураду рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў. Бо толькі рабоча-сялянскі ўрад, урад дыктатуры пралетарыяту, абапіраючыся на брацкі саюз рабочых і сялян, экспрапрыпуе капіталістых, канфіскуе на карысьць рабоча-сялянскага ўраду, банкі, фабрыкі і заводы, капальні і чыгункі, увядзе 7-гадзінны рабочы дзень, скасуе капіталістычную сыстэму прадукцыі, якая давала прыбыткі фабрыканту і буржуазнай дзяржаве, і гэтым самым зьнішчыць раз на заўсёды беспрацоўе так, як яно зьнішчана ў СССР.

Толькі рабоча-сялянскі ўрад канфіскуе памешчыцкую зямлю і аддасьць яе працоўнаму сялянству і батраком.

Толькі рабоча-сялянскі ўрад, урад дыктатуры пралетарыяту зьнішчыць імпэрыялістычныя трактаты, выраўнаць справу Верхняй Сілезіі на аснове права самавызначэньня аж да аддзяленьня, ажыцьцёвіць лёзунг самавызначэньня падняволеных польскім імпэрыялізмам Зах. Украіны і Зах. Беларусі і далучэньня іх да Украінскай і Беларускай Савецкіх рэспублік.

Толькі рабоча-сялянскі ўрад канфіскуе багатыя палацы буржуазіі і магнатаў і аддасьць іх на скарыстаньне работным і сялянам, дасьць свабоду тысячам палітвязьняў і ўсім засуджаным за барацьбу за штодзенны кавалак хлеба, а пасадзіць за краты крывапійцаў і катаў працоўных мас.

Толькі рабоча-сялянскі ўрад заключыць брацкі саюз з СССР, дзе разгортваецца магутнае сацыялістычнае будаўніцтва, дзе няма эксплёатацыі і прыгнечаньня працоўных мас.

«Рабоцкія і сяляне!

Урад і цэнтралевая «апазыцыя» хочуць з выбараў набудаваць плаціну, якая-б устрымала ваша імкненьне да барацьбы за хлеб, працу, зямлю і ўладу. Праламеце гэтую плаціну! **Ідзеце на сыбары, каб заманіфэставаць сваю волю да рэвалюцыйнай барацьбы!** Заклікаем вас згуртаванымі радамі стаць вакол камуністычнай партыі, супроць антыфашысцкага блёку. **Ні аднаго голасу рабочага і селяніна за ўрадавыя сьпісы і сьпісы ўрадавых агентаў з Цэнтралеву! Ні адзін з вас не павінен устрымацца ад галасаваньня!**

Стварайце на кожнай фабрыцы, капальні, варштацэ, фальварку і вёсцы органы аднаслітага фронту працоўных мас—антыфашысцкія выбарчыя камітэты. На кожны замах фашызму на вашу свабоду адкажэце масавай палітычнай забастоўкай і вулічнай дэманстрацыяй. Арганізуйце дружыны масавай рабоча-сялянскай самаабароны на кожнай фабрыцы, заводзе, фальварку, вёсцы!

Прэч фашысцкую дыктатуру Пілсудзкага! Сьмерць польскай ваўтарыі!

Прэч дэмакратычнае ашуканства Цэнтралеву!

Прэч акупацыю Зах. Украіны і Зах. Беларусі! Няхай жыве самавызначэньне аж да аддзяленьня і далучэньня Зах. Украіны і Зах. Беларусі да УССР і БССР!

Нехай жыве Савецкая Польшча!».

КРЫВАВЫ ТЭРОР ПІЛСУДЧЫНЫ У ЗАХ. УКРАІНЕ

ДЗІКІЯ ЭКЗЭКУЦЫІ І ЗАБОЙСТВЫ СЯЛЯН

Жудасныя малюнкі сяўдзяўякоўя

ВАРШАВА, 4. Штодня паступаюць жудасныя падрабязнасьці аб жорстка-сьці карных атрадаў, масавых экзэкуцыях, пупцаваньнях сялян у Зах. Украіне. Хваля крывавага фашысцкага тэрору заліває Зах. Украіну. Няма тэй вёскі, дзе-б ня было вобыскаў, арыштаў, дзікіх зьбіцьняў або забойстваў сялян. Адзін карны атрад выходзіць з вёскі, на яго месца прыходзіць другі. **Грабяжы сялянства, нішчэньне яго маемасьці ў знак помсты за панскія маёткі, барбарскія сярэднявяковыя катаваньні — як прывязваньне сялян за шыю да воза або да стрэмён кавалерыстага і так цяганьне ад вёскі да вёскі, — вось мэтады і сродкі, пры дапамозе якіх пілсудчына стараецца «ўціхамірыць» украінскую вёску.** Польская буржуазная прэса ад 3-га кастрычніка зьмясьціла кароткае паведамленьне аб тым, што па распарадзеньні камандуючага кавалерыйскім корпусам у Львове генэрала Паповіча, увесь корпус пачаў вайсковыя заняткі на абшарах Зах. Украіны. Заняткі гэтыя працягнуцца некалькі дзён. Эскадроны кавалерыі пачалі вайсковыя практыкаваньні ва ўсіх паветах Зах. Украіны.

Што гэта за вайсковыя практыкаваньні, ці заняткі цэлага кав. корпусу на абшарах украінскіх, тлумачэньня не патрабуецца. Як відаць, тысячных атрадаў паліцыі не хапіла для задушэньня рэвалюцыйных выступленьняў украінскага сялянства. Зараз выслана цэлы кавалерыйскі корпус для навядзеньня «парадку» і «ўціхамірваньня» украінскіх сабатажнікаў.

Побач з вайсковымі карнымі экспэдыцыямі розныя фашысцкія баёўкі праводзяць пагромы украінскіх культурна-асьветных, спартыўных і гаспадарчых арганізацый.

Так, сацыял-фашысцкі «Роботнік» ад 4 кастрычніка падае аб узрыве ва Львове памяшканьня украінскага цэнтральнага кааперацыйнага саюзу. Львоўская бульварная прэса зазначае, што сіла выбуху была настолькі вялікая, што будынак разбураны дашчэнту. Абломкамі паранена некалькі чалавек, якія праходзілі ў гэты момант па другой старане вуліцы.

Адначасова з гэтым праводзяцца далейшыя вобыскі і арышты сярод украінскіх вучняў і грамадзкіх дзеячоў. Так, у Яварове, Львоўскага павету, праведзены вобыскі ва украінскай гімназіі, настаўніцкай семінарыі і ў некаторых настаўнікаў і вучняў. У выніку — зноў некалькі дзесяткаў вучняў арыштаваны. У Тарнопалі 3-га кастрычніка арыштаваны рядомы украінскі дзеяч, б. дэпутат, адвакат Барэн.

Новы працэс камдэпутата Жарскага

Як падае «Газэта Варшаўска» ў Варшаўскім акруговым судзе ўжо другі дзень спускаецца справа б. дэпутата кампрэкцыі сойму т. ЖАРСКАГА і РАЙХА. Жарскі, як вядома, некалькі дзён таму назад быў засуджаны подзіснім акруговым судом на 8 год катаргі. Як Жарскі, так і Райх абвінавачваюцца у тым, што ЯНЫ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА ЧЛЕНАМІ ЦК КАМПАРТЫІ ПОЛЬШЧЫ. Будынак, дзе адбываецца суд, з самага прыезду да суда вуліцы АХОЎВАЮЦЦА ЗНАЧНЫМІ АТРАДАМІ ПЕШАЙ І КОННАЙ ПАЛІЦЫІ З КУЛЯМЕТАМІ. 3-га кастрычніка ў першы дзень працэсу групы рэвалюцыйнай моладзі прабавалі наладзіць перад будынкам суда дэманстрацыю, але былі разагнаны паліцыяй.

Суд складаецца з старшыні Казакоўскага і судзьдзяў: Пасямковіча і Лашкевіча, абвінавачвае пракурор Гушкоўскі. Сьведкамі зьяўляюцца выключна дэфэнзыўшчыкі, розныя правакатары, ШЫМБОРСКІ І ПАГАЖЭЛЬСКІ — КАМІСАРЫ II-га АДДЗЕЛУ ГЕНШТАБУ.тая галіны. Раёвыканкомам прадпісана.

Тав. Жарскі ў пачатку суда выступіў з патрабаваньнем адтэрміноўваньня справы з прычыны таго, што ён некалькі дзён толькі, як пераведзены ў Варшаву з Петракоўскай турмы і не паспеў нават азнаёміцца з актамі справы. Суд адхіліў гэтае патрабаваньне т. Жарскага і пачаў разгляд справы.

Характэрна, што буржуазная польская прэса ўчора пісала, што Жарскі абвінавачваецца ў арганізацыі дэманстрацыі ў Варшаве і закліку дэманстрантаў да нападу на адну з мясцовых турм. Сёньня прэса падае, што Жарскі ўжо абвінавачваецца ў тым, што зьяўляецца членам ЦК кампартыі Польшчы. Заўтра быць можа пачуем новае абвінавачваньне. Довадам гэтаму — прысутнасьць на судзе цэлага раду дэфэнзыўшчыкаў і камісара Пагажэльскага, вядомага ва ўсёй Польшчы спэца па фабрыкацыі папітычных працэсаў.

Чуткі аб зьмене выбарчага права

ВАРШАВА, 4. У сувязі з нарадай прэзыдэнта з Пілсудзкім «Газэта Варшавска» (орган эндэкаў) падае цыркулюючыя ў палітычных колах чуткі аб тым, што ў бліжэйшыя дні будзе апублікаваны дэкрэт прэзыдэнта аб зьмене выбарчага права. (ТАСС).

Да канца навігацыі скончыць сплаў

334 тысячы куб. мэтр. лесаматар'ялаў —на прыстанях

Купацкія гаспадаркі ня прыцягнуты да сплаўных работ

НІВОДНАГА Б�ЕРВЯНА НЕ ПАКІДАЦЬ У ВАДЗЕ

Да 1 лістапада скончыць кампанію

У гэтым годзе сплаў распачаўся з вялікім спазненьнем і зпрача гэтага тэмпы яго нездавальняючыя.

Так на 1-га лістапада з падвезеных для сплаву да прыстаняў 3.205.000 кубамэтраў дроў і лесаматар'ялаў пушчана ў сплаў толькі 2.860.000 кубамэтраў. Такім чынам на сёньнішні дзень на прыстанях ляжыць 334.000 кубамэтраў дроў. Ёсьць поўная пагроза, што сплаў ня будзе скончаны да закрыцьця навігацыі.

Сплаў тармозіцца, галоўным чынам, з-за адсутнасьці патрэбнай рабочай сілы. На працягу кастрычніка для пасьпяховага правядзеньня сплаву патрэбна ня менш 8.000 рабочых рук, а на сёньнішні дзень працуе ўсяго каля 4.000 чалавек.

Паводле пастановы асобнай камісіі пры СНК БССР, Наркампрацы павінен быў забясьпечыць сплаў 5.000 рабочых і мабілізаваць 1.000 кулацкіх гаспадарак для выкаткі дроў з вады. На сёньнішні дзень гэта пастанова ў жыцьцё не праведзена.

Уся кампанія па сплаве павінна быць скончана да 1-га лістапада. На дапамогу сплаўным арганізацыям павінны прыйсьці ўсе раённыя арганізацыі, камсамол і г. д.

Нельга дапусьціць, каб хаця-б адно бервяно засталося ў вадзе на зіму. Плян сплаву павінен быць выкананы поўнасьцю.

Лесазагатоўкі—на баявыя тэмпы

У мінулым годзе на БССР павінна было быць загатоўлена 4½ млн. кубамэтраў будаўнічых матар'ялаў і 5 млн. кубамэтраў дроў. Загатоўчая праграма выканана па будаўнічых матар'ялах на 90 проц., а па дровах—на 77,7 проц.

У гэтым годзе плян загатовак значна павялічаны, трэба загатовіць 6 млн. кубамэтраў дроў і 6 млн. кубамэтраў лесаматар'ялаў.

Пэрыяд кастрычнік—сьнежань зьяўляецца ў галіне лесазагатовак самым баявым пэрыядам.

Зараз мы маем рад прарываў у забясьпечэньні прамысловасьці сыр'ём,—храпінай, прарывы з забясьпячэньні гарадоў дровамі. Усе гэтыя прарывы павінны быць ліквідаваны на працягу кастрычніка месяца.

У кастрычніку мы павінны адгрузіць для забясьпячэньня дровамі рабочых Масквы 400.000 раўмэтраў дроў. Гэта задача павінна быць выкананa своечасова і поўнасьцю.

Пасьпяховае выкананьне лесазагатовак залежыць ад забясьпячэньня лесазагатоўчых работ рабочай і гужавой сілай. Пастанова ЦВК і СНК БССР ад 26-IX г. г. дае выразную і ясную дырэктыву ў гэтым пытаньні. Раёвыканкомам прадпісваецца плян загатовак і вывазкі дроў давесьці да паасобнай вёскі, калгасу і саўгасу.

Для ажыцьцяўленьня пастановы ЦВК трэба прыцягнуць усю грамадзкасьць вёскі.

Плян загатовак і вывазкі дроў павінен быць пастаўлены на абмеркаваньне сельскіх сходаў.

Сацыялістычныя мэтады працы: сацспаборніцтва, ударніцтва, грамадзкі буксір, вытворчы маёнтэр трэба шырока ўжываць пры правядзеньні лесазагатовак.

Наркампрацы павінен дапамагчы арганізацыі рабочай і гужавой сілы на лесазагатоўках.

Белкаапсаюз і яго аддзяленьні на мясцох павінны завесьці на месцы лесных работ вызначаныя фонды хлебафуражу і прамтавараў. На лесазагатоўках трэба арганізаваць ларкі, грамадзкія сталоўні і кацельнае харчаваньне. Наркам. аховы здароўя павінен адкрыць на месцы работы мэдычныя пункты і наладзіць выезды мэдычнага персаналу.

Уся работа на загатоўцы і вывазцы лесу павінна быць пастаўлена на баявую ногу.

П.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

УДАРНЫЯ ТЭМПЫ---САЦЫЯЛІСТЫЧНАМУ ТРАНСПАРТУ!

Камуністыя-чыгуначнікі на справе павінны даказаць сваю вернасьць генэральнай лініі партыі

Па правых апартуністых, рвачах, прагульшчыках---руйнуючы агонь!

Зьмесьці апартуністых

са сталёвых шляхоў сацыялістычнага транспарту

Партыя паставіла задачу ператварыць транспарт у перадавы вучастак сацыялістычнага будаўніцтва. Ажыцьцяўленьне гэтай задачы патрабуе ад транспартных партарганізацый, ад усіх камуністых-транспартнікаў — баявых тэмпаў работы, пенахіснай бальшавіцкай настойлівасьці ў змаганьні за генэральную лінію партыі, за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Першарадная і галоўная задача партыйных ячэек і калектываў транспарту — перамагчы тыя апартуністычныя хістаньні, якія праяўляюцца ў іх радох з боку асобных камуністых. Бо задачы рэканструкцыі транспарту магчыма ажыцьцявіць толькі на аснове выразнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, толькі выкараніўшы з практыкі работы паасобных камуністых апартунізм, хвасьцізм, руцінёрства, якія сталі ўпоперак дарогі новых посьпехаў і перамог.

Асеньня-зімовыя перавозкі, у якія ўжо ўступіў транспарт, павінны зьявіцца экзамэнам для ўсіх транспартных партарганізацый. А з таго, наколькі транспарт справіцца з выкананьнем плянаў перавозак, партыя будзе судзіць аб рабоце транспартных арганізацый.

Першае, чаго павінны ў сваёй рабоце дабіцца транспартныя арганізацыі гэта — выразнасьці ў рабоце адміністрацыйна-гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый у адпаведнасьці з ажыцьцяўленьнем лёзунгу «тварам да вытворчасьці».

Матар'ялы з месц, у прыватнасьці з Гомельскага чыгуначнага вузла, сьведчаць аб недапушчальна дрэнным разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва на чыгунцы. Камуністыя вузла ня толькі ня былі перадавікамі ва ўдарных брыгадах, а пляліся ў хвасьце адсталых рабочых, загрузьлі ў апартуністычным балоце. Гэта павінна прымусіць транспартныя арганізацыі ўзяцца па-бальшавіцку за кіраўніцтва сацспаборніцтвам, ударніцтвам. Камуністы-транспартнікі павінны на справе давесьці сваю адданасьць генэральнай лініі партыі, сваю здольнасьць змагацца за вышыні сацыялістычнага будаўніцтва.

Толькі мабілізацыя актыўнасьці і энэргіі шырокіх рабочых мас вакол асноўных задач партыі, пралетарскай самакрытыкі, бальшавіцкай непрымірымасьці ў барацьбе за лінію партыі забясьпечаць выкананьне тых задач, якія партыя ўскладае на транспартныя партарганізацыі.

НА ТАРМАЗОХ

У рабоце мясцовага транспарту (Менск) панує злачынная безгаспадарчасьць і адсутнічае плянавасьць. З боку УМТ'у ня прынята адпаведных захадаў да заключэньня дагавораў з тымі арганізацыямі (МЦРК, аддзяленьне хлебазаводу), якія абслугоўваюцца мясцовым транспартам. Такое становішча вельмі дрэнна адбіваецца на забясьпячэньні своячасовай дастаўкі прадуктаў у крамы МЦРК. Бываюць выпадкі, калі хлебныя крамы пустуюць, у той час, як у пякарні застаюцца вялікія запасы хлеба.

На гэтыя адмоўныя зьявішчы партыкіраўніцтва УМТ'у не рэагавала. Галоўнейшымі пытаньнямі гаспадарчага становішча, як выкананьне вытворчай праграмы, узмацненьне працдысцыпліны і арганізацыя сацыялістычных мэтадаў работы, ячэйка не займалася. Партыкіраўніцтва УМТ'у ў гэтай справе літаральна бязьдзейнічала.

Пры такім апартуністычным кіраўніцтве актыўнасьць і ініцыятыва рабочых мас не магла даць вытворчага эфэкту. З агульнай колькасьці рабочых 40 проц. зьяўляецца ўдарнікамі. Але выкананьню ўзятых ударнікамі абавязкаў перашкаджае тое, што няма вытворчай праграмы і кантрольныя заданьні не даведзены да рабочых. Нядбайныя адносіны да работы з боку адміністрацыі, апартуністычная практыка партыйнага і прафсаюзнага кіраўніцтва УМТ'у глушаць рабочую ініцыятыву. Рад рабочых падалі ў мясцком заявы аб тым, што іх ударнай рабоце перашкаджае бязьдзейасьць кіраўніцтва. І вось, пасьля такіх заяў парт'ячэйка і мясцком нічога не зрабілі ў справе забясьпячэньня разьвіцьця ўдарнага руху.

Для пацьвярджэньня правільнасьці заяў рабочых аб бязьдзейнасьці кіраўніцтва даволі паказаць на тое, што ПАРТ'ЯЧЭЙКА ЗА ГЭТЫ ГОД НІ РАЗУ НЕ АБМЯРКОЎВАЛА ПЫТАНЬНЯ ВЫКАНАНЬНЯ ВЫТВОРЧАЙ ПРАГРАМЫ. За гэты час праведзены толькі тры вытворчых нарады, а пастановы нарад адміністрацыяй ня выконваюцца.

Апартуністычная практыка кіруючых арганізацый УМТ'у прывяла да зьнижэньня працдысцыпліны. Норма дзённых перавозак возчыкамі станцыі выконваецца толькі на 87 проц. Нават хлебнікі і возчыкі ЦРК, якія норму перавозак за чэрвень і ліпень выконвалі на 108-121 проц., за апошнія месяцы далі значнае зьніжэньне.

Ів.

Вывесьці з тупіка

Гомельскі чыгуначны вузел працуе бяз усякага вучоту, эканамічнага становішча раёну. Заданьні па асноўных эксплёатацыйных вымеральніках не зьяўляюцца цьвёрдымі і сталымі, яны хістаюцца ў залежнасьці ад выкананьня работ, а не ад патрэб і магчымасьцяй. Такое становішча стварае на вузьле безгаспадарчасьць і безадказнасьць.

У рабоце партарганізацыі вузлу адсутнічае ўвязка работ з чарговымі палітычнымі задачамі партыі, што прыводзіць да праяў правага апартунізму на практыцы, які асабліва выяўляецца ў недаацэнцы сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Ёсьць «масабоязьнь» і даволі пашыранае імкненьне апраўдаць свае недахопы і прарывы ў рабоце «аб'ектыўнымі» прычынамі. Характэрна, што паміж практычнай работай, будаўніцтвам і задачамі, высунутымі XVI зьездам партыі перад транспартам, ёсьць вялізарны разрыў.

Пытаньне росту партарганізацыі за кошт лепшых рабочых ударнікаў не пастаўлена ва ўсю шырыню перад партыйнымі цэхячэйкамі. Характэрна, што ў першым квартале чыгуначнымі ячэйкамі было прынята 105 рабочых, у другім—65 і ў трэцім толькі 24 чал. Гэтыя лічбы гавораць за тое, што рост партыі адбываўся пакампанейску, без сыстэматычнай плянавай работы, між тым як на чыгунцы ёсьць вялікія магчымасьці росту партыйных ячэек за лік адданых партыі перадавых рабочых.

На працягу другога паўгодзьдзя мінулага гаспадарчага году, прадпісыцыліна ўвесь час зьніжалася амаль на ўсіх прадпрыемствах і службах. Сярод асоб, якія парушаюць працоўную дысцыпліну, ёсьць значная колькасьць камуністых. Ніводная ячэйка вузлу не заварстрыла пытаньня барацьбы за працоўную дысцыпліну, не змагалася з тымі «камуністымі», якія ігнаруюць дырэктывы партыі і дэзэртуюць з фронту сацыялістычнага будаўніцтва.

У часе чысткі чыгуначная арганізацыі было выяўлена, што значная частка камуністых, якая жыве ў вёсцы і зьвязана з сельскай гаспадаркай, адмаўлялася ўступаць у калгасы. Пасьля чысткі чыгуначныя ячэйкі правялі значную работу сярод камуністых па пытаньні калектывізацыі. За апошнія месяцы ячэйкі гэту работу яўна паслабілі. Увосень гэтага году рад камуністых выйшаў з калгасаў, аб чым ячэйкі нават ня ведаюць. 20 проц. (больш за 200 чал.) партыйцаў чыгункі маюць свае ўласныя дамы. Больш паўгода таму назад было ўзьнята пытаньне аб каапэраваньні дамоў камуністых. Факты паказваюць, што гэта справа да гэтага часу ня зрушылася з месца. 40 членаў і кандыдатаў партыі, якія давалі згоду аддаць свае дамы каапэрацыі, у апошні час свае заявы забралі назад. Ячэйкі слаба або зусім не рэагавалі на гэтыя факты.

Ёсьць рад фактаў, калі паасобныя камуністы адкрыта выступаюць у абарону кулака (ячэйка кандуктарскіх брыгад).

Усім гэтым правааапартуністычным вылазкам партарганізацыя вузлу не давала належнага адпору, не мабілізавала нас на барацьбу за генэральную лінію партыі, за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Прарывы, якія мелі месца на чыгунцы, паказваюць на слабасьць партыйнага кіраўніцтва пытаньнямі гаспадарчай работы. Большасьць ячэек да гэтага часу ня выканала асноўнай задачы—не павярнулася тварам да вытворчасьці. Ячэйкі ня ўзьнялі на прынцыпова палітычную вышыню пытаньня гаспадарчай работы. Большасьць ячэек барацьбу за выкананьне плану і вымяральнікаў разглядае, як бягучую работу, але не як пытаньне клясавай барацьбы.

Вынікам гэтага зьяўляецца тое, што камуністыя далёка ня ўсе прыкладны на вытворчасьці. У жніўні, **на 9-м вучастку цягі псаваньне паравозаў у большасьці адбывалася па віне камуністых.**

Прарывы ў партыйным кіраўніцтве гаспадарчымі пытаньнямі выяўляюцца ў недаацэнцы вытворчай работы і пануменьні, а часам і ў нежаданьні мабілізаваць масы на зьнішчэньне вузкіх месц у сябе на прадпрыемстве. Недаацэнка работы на вытворчасьці выяўляецца і ў тым, што партарганізацыя сваю работу перабудавала толькі фармальна і ні ў якім разе ня выканала дырэктывы аб карэнным перабудове ўсяго сыстэмы работы з такім разьлікам, каб канцэнтраваць увагу, у першую чаргу на пытаньнях барацьбы за прамфінплян.

Ня гледзячы на ўрокі, якія атрымала партарганізацыя ў сувязі з заціскам самакрытыкі ў Гомелі, да гэтага часу на чыгунцы няма патрэбнага ўзруху ў бок бальшавіцкага разгортваньня самакрытыкі і рашучай барацьбы з усімі праяўленьнямі заціску самакрытыкі. Ёсьць выпадкі ня толькі боязьні крытыкаваць але і факты, якія сьведчаць аб тым, што заціск самакрытыкі на чыгунцы да гэтага часу існуе. Пасьля пастаноў ЦК і ЦКК КП(б)В аб Гомелі выявілася, што ў 9-м вучастку цягі прасьледвалі рабкораў, зьнімалі з работы.

Мы лічым, што становішча на Гомельскім вузле яскрава гаворыць за тое, што барацьба з праявамі правага апартунізму ня стала арганічнай часткай барацьбы партарганізацыі за генэральную лінію партыі, што адміністрацыя вузлу і партыйнае кіраўніцтва на радзе вучасткаў гаспадарчай работы ня здолелі своячасова мабілізаваць сілы партарганізацыі і рабочых на ліквідацыю прарываў і на бальшавіцкую сустрэчу трэцяга году пяцігодкі.

У. М-іч.

Асеньня-зімовыя перавозкі—экзамэн для партарганізацыі вузла

Рэзалюцыя па-зачарговай Кастрычніцкай райпартканфэрэнцыі аб асеньня зімовых перавозках

Канфэрэнцыя адзначае, што з боку адміністрацыі вузла і Саюзтрансу за апошні час ужыты некаторыя мэрапрыемствы па асеньня-зімовых перавозках (перавод аўтатранспарту на 18-гадзінны працоўны дзень, частковая разгрузка прырэйкавых складаў, рамонт пакгаузаў), адначасова падкрэсьлівае наступныя недахопы:

1. Несвоячасовая падача вагонаў і не да месца выгрузкі.

2. Ня выконваецца асноўныя паказальнікі на звароце вагонаў, прастой вагонаў замест 10 з пал. гадзін—15,6. Прастой вагонаў у жніўні 15 гадзін, а ў верасьні да 40 гадзін.

3. Прабег паравозаў пры заданьні ў 181 кілёмэтр—у ліпені 159 кілёмэтраў, а ў жніўні 153,9.

4. Недавыкананьне норм прабегу цягнікоўых і паравозных брыгад, таварных цягнікоў у жніўні на 21 проц., у верасьні—26 проц.

5. Наяўнасьць выпадкаў паломак вагонаў.

6. Адсутнасьць запасных частак для цягнікоў.

7. Незабясьпячэньне адміністрацыяй чыгункі патрэбным інвэнтаром для нагрузачных работ.

Саюзтрансам ня выканана дырэктыва па набудове складу для хлебных грузаў. Да гэтага часу рад арганізацый, у тым ліку Саюзтранс, не спраўляцца з разгрузкай вузла. Склады не забясьпечаны адпаведнымі пал'язнымі веткамі, ёсьць выпадкі накіраваньня грузаў Саюзтрансам не па прызначэньні. Саюзтрансам ня выканана дырэктыва аб павялічэньні аўта і гужтранспарту і няпоўнасьцю выкарыстоўваецца наяўны транспарт. Саюзхлеб ня прыняў адпаведных мер па апаражненьні прырэйкавых складаў, прызначаных для збожжазагатовак і не забясьпечыў патрэбнай тарай.

Усе гэтыя недахопы ствараюць пагрозу арыву асеньня-зімовых перавозак.

Партканфэрэнцыя адзначае, што **партыйная арганізацыя вузла не перабудавала сваёй работы так, каб яна забясьпечыла нармальны ход працы на транспарце.** Рад балючых зьявішч ёсьць зараз на транспарце з прычыны незадавальняючага становішча працдысцыпліны, нерацыянальна выкарыстаньня ўсіх жывых сіл і сродкаў.

Партарганізацыя чыгункі **не мабілізавала** шырокія працоўныя масы чыгуначнікаў на барацьбу з расхлябанасьцю, гультаямі і лятунамі, яна не мабілізавала на сёньнішні дзень, каб даць адпор усялякім антысавецкім, контр-рэвалюцыйным настроям, якія ў апошні час прымаюць характар адкрытых выступленьняў.

Камуністыя і камсамольцы на вузле **не зьяўляюцца** правадзінкамі ідэй сацспаборніцтва і ўдарніцтва. З агульнага ліку 450 камуністых па ўдарных брыгадах знаходзіцца—154.

3. Улічваючы вялізарнейшыя задачы, якія стаяць перад вузлом на бліжэйшы пэрыяд, партканфэрэнцыя прапануе партчастцы кіраўніцтва (парткалектыву) пашырыць усе захады, каб своячасова праводзілася як падача вагонаў, так і выкананьне асноўных паказальнікаў працы на вузле, важнейшымі з якіх павінны зьяўляцца нармальны прастой вагонаў, сярэдня-сутачны прабег вагонаў, прабег брыгады і інш.

Партканфэрэнцыя прапануе, каб у штодзённай рабоце адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу вузла, побач з прыцягненьнем шырокіх рабочых мас па вытворчай рабоце, больш праводзіць у жыцьцё прынцып адзіначальля па падставе дырэктыў партыі.

4. Партканфэрэнцыя прапануе, партыйнаму калектыву вузла на падставе адозвы ЦК УсеКП(б) **мабілізаваць усю партыйную, камсамольскую, гаспадарчую і прафсаюзную арганізацыі на ліквідацыю прарываў,** пачынаючы сваю работу, галоўным чынам, з наладжаньня транспарту да асеньня-зімовых перавозак, выкананьня асноўных паказальнікаў працы чыгункі.

5. Надыходзячы **асеньня-зімовы пэрыяд зьяўляецца экзамэнам для ўсёй партыйнай арганізацыі і ўсяго калектыву рабочых чыгуначнікаў.** Работа партыйнай арганізацыі будзе ацэньвацца тымі, наколькі асеньня-зімовыя перавозкі будуць забясьпечаны бальшавіцкімі тэмпамі работы. Для гэтага работу партыйнага калектыву трэба перабудаваць пад лёзунгам «тварам да асеньня-зімовых перавозак», апіраючыся на ўдарныя брыгады, пашыраючы іх рады, у бліжэйшы час правесьці ў жыцьцё дырэктывы партыі: «ні аднаго партыйца і камсамольца па-за радамі ўдарных брыгад».

6. Партканфэрэнцыя прапануе ўсім камуністым і камсамольцам і перадавой частцы рабочых вузла больш мабілізаваць сябе для адпору ўсякім антысавецкім выступленьням і настроям, дачы ім рашучы і своячасовы адпор.

7. Прапанаваць фракцыі станцыйнага камітэту ў бліжэйшы час правярыць, наколькі ў працы вытворчага сэктару і вытворчых нарад адбываецца абгаварэньне раду пытаньняў, зьвязаных з асеньня-зімовымі перавозкамі, прапрацоўка кантрольных лічбаў і сустрэчнага прамфінпляну. Трэба, каб абгаварэньне гэтых спраў было даведзена да кожнага рабочага, шляхам арганізацыі вытворчых маёнтэраў, грамадзкага буксіру для падцягваньня адсталых цэхаў калектываў.

8. Парткалектыву пабудаваць сваю работу сярод інжынэрна-т

Апэрацыйныя зводкі барацьбы за прамфінплян

ЦЬВЁРДА КУРС НА СУСТРЭЧНЫ!

Трыкутнікі, у нагу з ударнікамі, на барацьбу з расхлябанасьцю

„Чырвоная Бярэзіна", „Энэргія", Бабруйскі камбінат, пралетарская грамадзкасьць чакае ад вас сапраўдных ударных тэмпаў

ВЫРАТУЕМ 120.000 РУБ. ЗОЛАТАМ

„Энэргія" зрывае работу фабрыкі „Спартак"

У маі месяцы завод «Энэргія» прыняў заказ на трансьмісію, якая патрэбна Шклоўскай папяровай фабрыцы «Спартак», для пераводу фабрыкі на харчаваньне токам Асінбуду. Апошні тэрмін выкананьня заказу—сьнежань бягучага году. 21 ліпеня прэзыдыум ВСНГ прапанаваў заводу «Энэргія» паскорыць выкананьне заказу фабрыкі «Спартак».

Аднак, Белмэталяаб'яднаньне зараз, ПАСЬЛУ 4-х МЕСЯЦАЎ СА ДНЯ АТРЫМАНЬНЯ ЗАКАЗУ, АНУЛЯВАЎ ЗАКАЗ ФАБРЫКІ «СПАРТАК». Адсутнасьць трансьмісіі таксаманя дасьць магчымасьці пусьціць завод па выпрацоўцы драўнянай масы, што прымусіць павялічыць імпарт сырцу на 20.000 руб. штомесячна, або на 120.000 руб. у год.

Малюнак мастака Бразэра

Памочнік майстра медна-ліцейнага цэху СЯРОЖНІКАЎ П. П. — кіраўнік ударнай брыгады, якая перавыконвае сустрэчны прамфінплян.

Гута імя Домбаля—на буксір „Зьвязды"

ТРЫВОЖНЫЯ ЗВОДКІ АБ ВЫКАНАНЬНІ ПРАГРАМЫ ГУТАЙ ІМЯ ДОМБАЛЯ ВЫКЛІКАЮЦЬ НЕПАКОЙ УСЕЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ. РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА», ДЛЯ ПРАКТЫЧНАЙ ДАПАМОГІ ГУЦЕ ІМЯ ДОМБАЛЯ Ў СПРАВЕ ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВУ, КАМАНДЫРАВАЛА НА ЗАВОД ДВУХ СВАІХ ПРАДСТАЎНІКОЎ, ЯКІЯ РАЗАМ З ПРАДСТАЎНІКАМІ ЦК САЮЗУ І БАГУШЭЎСКАГА РАЙКОМУ ЎЗЯЛІ ГУТУ ІМЯ ДОМБАЛЯ НА ГРАМАДЗКІ БУКСІР.

ЗАВОДЗКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ АКАЗАЦЬ БУКСІРУ МАКСІМАЛЬНАЕ ПАДТРЫМАНЬНЕ І РАЗАМ З ІМ ДАВІЦЦА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ ТЭМПАЎ РАБОТЫ ЗАВОДУ.

Зьлет ударнікаў у Барысаве

Учора адкрыўся зьлёт ударнікаў Барысава.

На зьлёце прысутнічаюць 100 чал. з усіх прадпрыемстваў. Пасьля дакладу старшыні гарсавету Кудраева аб выкананьні прамфінпляну за 2-гі год пяцігодкі і арганізацыі сустрэчнага прамфінпляну былі заслуханы рапарты дырэктароў і старшых брыгадзіраў аб выкананьні прамфінпляну.

У спрэчках ударнікі аднадушна заяўлялі, што прарывы будуць ліквідаваны і плян ударнага кварталу будзе выкананы.

Л. К.

За 4-га кастрычніка ніякіх паляпшэньняў

Першыя мерапрыемствы адміністрацыі „Чырвонай Бярэзіны"

Учора мы зьмясьцілі першую зводку выкананьня праграмы ўдарнага кварталу на запалкавых фабрыках «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская Перамога». Мы канстатавалі, што праграма, асабліва па «Пралетарскай Перамозе», НЯ ВЫКОНВАЕЦЦА. За 4-га кастрычніка ніякіх зьмен на фабрыцы ня было. «Чырвоная Бярэзіна» 3-га кастрычніка выпрацавала 1.040 скрынь запалак, 4-га кастрычніка — 1.067 (замест плянавых 1.140 СКРЫНЬ). «Пралетарская Перамога» 4 кастрычніка вырабіла 1.816 скрынь (замест плянавых 2.550).

Апрача тых прычын, на якія паказвалі ўчора, выяўляюцца яшчэ наступныя: ў каробачным цэху СТАЯЦЬ 9—10 КАРОБАЧНЫХ МАШЫН 3-ЗА АДСУТНАСЬЦІ ПАТРЭБНАЙ КОЛЬКАСЬЦІ РАБОЧАЙ СІЛЫ. Прыблізна столькі-ж рабочых не хапае ПА ЭТЫКЕТНЫМ ЦЭХУ. 4-га кастрычніка барысаўская біржа працы прыслала 5 чал. Але гэтая колькасьць ня можа задаволіць патрэбнасьці фабрыкі ў рабочай сіле БАРЫСАЎСКАЯ БІРЖА ПРАЦЫ ПАВІННА ПРЫНЯЦЬ ЭНЭРГІЧНЫЯ МЕРЫ ДЛЯ ПОЎНАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ ФАБРЫКІ АДПАВЕДНАЙ КОЛЬКАСЬЦЮ РАБОЧЫХ.

Другая прычына прарыву — ВЯЛІКІ ПРОЦАНТ БРАКУ ПРЫ КАРОБАЧНЫХ МАШЫНАХ. Гэта зьвязана, з аднаго боку, з няўважлівасьцю каробачніц, з другога боку—з ня зусім выразнай работай шчапельнага аддзяленьня, ЯКОЕ ДАЕ КЕПСКУЮ ШЧЭПУ.

Для ліквідацыі прарыву адміністрацыя з учарашняга дня арганізуе ўлік браку КОЖНАЙ КАРОБАЧНАЙ МАШЫНЫ ПААСОБНА. Па этыкетным цэху ўводзіцца ПРЭМІЯЛЬНАЯ СЫСТЭМА ЗАРПЛАТЫ: работніцы, якія будуць выпрацоўваць звыш 70 касэт, атрымаюць 10 проц. расцэнкі ў якасьці прэміі, работніцы, якія будуць выпрацоўваць звыш 80 касэт, атрымаюць 15 проц.

4-га кастрычніка адбылася аб'яднаная шырокая вытворчая нарада рабочых стругальнага і каробачнага цэхаў. Расправцаваны рад мерапрыемстваў. РАБОЧЫЯ ЎНЕСЬЛІ ШМАТ КАШТОЎНЫХ ПРАПАНОЎ, якія, паводле абяцаньня дырэктара фабрыкі т. Альфіровіча, БУДУЦЬ ВЫКАНАНЫ Ў ВЫЗНАЧАНЫЯ ТЭРМІНЫ.

Віцебскія гарбары, вашы абсацы разваль вацца

ВЫ ЗРЫВАЕЦЕ ПРАГРАМУ МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ

ПАВОДЛЕ СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ, МЕНСКАЯ АБУТКОВАЯ ФАБРЫКА ПАВІННА ДАВАЦЬ ШТОДЗЕННА 3.500 ПАР АБУТКУ. АЛЕ З ТАЕ ПРЫЧЫНЫ, ШТО ЗАГАТОЎКІ СЫРЦУ НЕ ПАСЬНЯВАЮЦЬ ЗА ТЭМПАМІ РАЗГОРТВАНЬНЯ АБУТКОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, УСЕСАЮЗНАЕ СКУРАБ'ЯДНАЬНЕ ВЫЗНАЧЫЛА ДЛЯ БССР КОЛЬКАСЬЦЬ СЫРЦУ, ЯКАЯ ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ ПУСК ВА ЎДАРНЫМ КВАРТАЛЕ ТОЛЬКІ 800.000 ПАР АБУТКУ. БЕЛСКУРАБ'ЯДНАЬНЕ ПАТРАБУЕ АД УСЕСАЮЗНАГА СКУРАБ'ЯДНАНЬНЯ СЫРЦУ НА 950.000 ПАР МІНІМУМ. ГЭТАЕ ПАТРАБАВАНЬНЕ ПАДТРЫМЛІВАЕ І БЕЛКАМІТЭТ САЮЗУ ГАРБАРОЎ, ЯКІ ЗАЎЧОРА ПАСЛАЎ АДПАВЕДНАЕ ХАДАЙНІЦТВА Ў ЦК САЮЗУ.

У СУВЯЗІ З ГЭТЫМ, МЕНСКАЯ АБУТКОВАЯ ФАБРЫКА АТРЫМАЛА ЗАДАНЬНЕ ВЫРАБЛЯЦЬ ШТОДЗЕННА 3.300 ПАР АБУТКУ. 1-га КАСТРЫЧНІКА БЫЛО ПУШЧАНА 4.054 ПАР АБУТКУ. АЛЕ ГЭТЫ ДЗЕНЬ НЕ ПАКАЗАЛЬНЫ, БО Ў ГЭТУЮ ЛІЧБУ ЎКЛЮЧАНА ВЫПРАЦОЎКА АДНЭЙ ЗЬМЕНЫ АД 30-га ВЕРАСЬНЯ. 2-га КАСТРЫЧНІКА ЗРОБЛЕНА 3.300 ПАР, 3-га—3.310 і 4-га КАСТРЫЧНІКА—2.898. ЗНАЧНАЯ НЕДАВЫПРАЦОЎКА АПОШНЯГА ДНЯ ТЛУМАЧЫЦЦА ВЫКЛЮЧНА ТЫМ, ШТО АБСАЦЫ ШТАМПОВАЧНАГА ЦЭХУ ВІЦЕБСКАЙ ГАРБАРНІ, ЯКАЯ ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ МЕНСКУЮ АБУТКОВУЮ ФАБРЫКУ НЕКАТОРЫМІ МАТАР'ЯЛАМІ, ВЕЛЬМІ ДРЭННАЙ ЯКАСЬЦІ І РАЗВАЛЬВАЮЦЦА. З ГЭТАЕ ПРЫЧЫНЫ 600 ПАР АБУТКУ ЗАРАЗ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў РАМОНЦЕ.

НАОГУЛ ТРЭБА АДЗНАЧЫЦЬ, ШТО МЕНСКАЯ АБУТКОВАЯ ФАБРЫКА ЎЖО ПАЧЫНАЕ АДЧУВАЦЬ НЕКАТОРЫ НЕДАХВАТ СЫРЦУ І МАТАР'ЯЛАЎ. І ПАТРАБУЕМ АД БЕЛАРУСКАГА АДДЗЯЛЕНЬНЯ СКУРСЫНДЫКАТУ, У ПРЫВАТНАСЬЦІ, АД ЯГО КІРАЎНІКА ТАВ. ЦЭМКІНА, ПРЫНЯЦЬЦЯ РАШУЧЫХ МЕР ДЛЯ ПОЎНАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ БЕЛАРУСКАЙ АБУТКОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ПАТРЭБНАЙ КОЛЬКАСЬЦЮ СЫРЦУ І МАТАР'ЯЛАЎ.

Новы квартал---новыя непаладкі

БАБРУЙСК, 5. (Па тэлефону ад наш. кар.). Новы ўдарны квартал пакуль што ня прынёс рашучага пералому ў рабоце Бабруйскага камбінату. Беладрэўны цэх адчувае недахват матар'ялу. Учора былі спынены ўсе 12 сушыльных камэры. Сёньня стаяць тры камэры, не хапае дошак. Варштаты цэхаў працуюць з перабоямі. Прастоі дасягаюць 50 проц. Не хапае таксама фанэрнай філёнкі.

Лесапільны цэх за першыя дні кастрычніка выканаў заданьне няпоўнасьцю. Варштаты № 1 і 2 выканалі праграму за 1 і 2 кастрычніка на 83,5 проц., за 3, 4 і 5 кастрычніка—на 95 проц. Адзін варштат прастаяў два дні. Наогул, у цэху вялікія прастоі, якія зьвязаны з частымі паломкамі варштатаў, праўкай піл і г. д.

Фанэрны цэх учора пачаў работу, але клеявых матар'ялаў хопіць толькі на адзін дзень.

МАГІДАЎ.

Ці так прапрацоўваюць кантрольныя лічбы?

Бабруйскі камбінат зноў працуе з перабоямі

Учора ўвечары пасьля работы на заводзе «Энэргія» павінны былі адбыцца два агульных сходы рабочых кацельнага і ліцейнага цэхаў для абмеркаваньня вынікаў прапрацоўкі кантрольных лічбаў ударнага кварталу і сустрэчнага прамфінпляну.

З прычыны НЯДБАЙНЫХ АДНОСІН ЗАЎКОМУ І ЦЭХКАМІТЭТАЎ ДА СКЛІКАНЬНЯ СХОДАЎ, сход у ліцейным цэху БЫЎ САРВАНЫ. У кацельным цэху сход працягваўся ўсяго 10-15 мінут. МЭХАНІЧНА, па прапанове сакратара цэхавай парт'ячэйкі, які зрабіў інфармацыю аб пастановах вытворчай нарады і брыгад, пастановы гэтыя былі СКАСАВАНЫ і кантрольныя лічбы павялічаны. Кепскае абмеркаваньне кантрольных лічбаў і невыстарчальнае тэхнічнае абгрунтаваньне некаторых прапаноў наогул не дае гарантыі выкананьня сустрэчнага прамфінпляну.

МЫ ПРАПАНУЕМ ЗАВОДЗКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ ТЭРМІНОВА ВЫПРАВІЦЬ СВАЮ ПАМЫЛКУ. Падрабязна аб ходзе прапрацоўкі кантрольных лічбаў і выніках сходаў будзе зьмешчана ў заўтрашнім нумары «Зьвязды».

ПОЎНАЯ РАСХЛЯБАНАСЬЦЬ

На Віцебскай швейнай фабрыцы № 2 «Прафінтэрн» — адчуваецца поўная расхлябанасьць кіраўніцтва. 26-га верасьня дырэкцыя Віцвэя дала распараджэньне загадчыку фабрыкі перавесьці апошнюю на бесьперапынку і выпрацоўку суконных майтак. 29-га верасьня было атрымана другое распараджэньне — выпрацоўваць ня толькі суконныя, але і бавоўняныя майткі. Фабрыка перайшла на бесьперапынку без належнай падрыхтоўкі. Рабочая маса ня была інфармавана. Ня складзены план лепшай расстаноўкі машын. Не падрыхтаваны мэханікі. Таму наглядаецца шмат нічэйнак у рабоце цэху.

Дзень ударніка сарваны. Спачатку прызначылі скліканьне канфэрэнцыі ўдарнікаў на 5 кастрычніка, потым перадумалі і прызначылі на 1 кастрычніка. З 120 рабочых першай зьмены зьявілася толькі 20 чал. Канфэрэнцыя ня была падрыхтавана. Камісія па прэміяваньні высунула кандыдатаў на прэмію, сярод якіх былі і прагульшчыкі.

РАСІН, ШУЛЬМАН.

Малюнак мастака Бразэра

«СУСТРЭЧНЫ» ПЕРАВЫКОНВАЕЦЦА. Ударнік Гомельскага заводу «Пралетары» — вагранщык медна-ліцейнага цэху БАНДАРЭНКА МАЦЬВЕЙ МІХАЙЛАВІЧ. Заданьне яго па сустрэчным прамфінпляне — 49,5 тон ліцьця, выпускае звыш 60 тон. Тав. Бандарэнка прадстаўлены да ўзнагароды і прозьвішча яго зайсьсена на чырвоную дошку.

Пагроза рабочаму забесьпячэньню

У сувязі з добрым ураджаем ільніцы і ростам ужываньня дрожджаў у грамадзкім харчаваньні і кандытэрскай прамысловасьцю, значна павялічыўся попыт на дрожджы. Але замест таго, каб павялічыць выраб дрожджаў, мы апынуліся перад фактам недахвату сырцу (мэлясу).

Ужо два дні, як завод «Чырвоная Зара» скараціў напалову выпуск прадукцыі. Белхарчаб'яднаньне не прыняло адпаведных мер для ўзмацненьня вывазу мэлясу з цукравых заводаў. Толькі зараз камандыраваны адказныя прадаўнікі аб'яднаньня для паскарэньня адгрузкі мэлясу. Апрача таго, завод адчувае недахват фанэрных дошак для скрынак.

Такое-ж становішча на заводзе «Прадэтары». Белхарчаб'яднаньне павінна лепш выконваць свае абавязкі па забесьпячэньні заводаў сырцом і адпаведнымі матар'ялам.

РАБКОР.

УЗМАЦНІМ ФІНАНСАВУЮ БАЗУ 3-га ГОДУ ПЯЦІГОДКІ

МЕСЦЫ ЯШЧЭ НЕ РАЗГАРНУЛІ РАБОТЫ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ

Бязьдзейнасьць б'е па бюджэтным пляне

Па БССР рэалізавана пазыкі на 12 міл. руб.

Паводле вестак Наркамфіну БССР, па Беларусі на 1-га кастрычніка рэалізацыя пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» дасягнула 12 млн. руб., што складае 81,1 проц. заданьня. Афармлена 7.582.600 руб. папярэдняй падпіскі, або 63,2 проц.

Сярод рабочых і служачых сабрана падпіскі на 10 млн. руб., або 80,8 проц. заданьня. Сярод сялян—1.330.000 руб.—заданьне выканана на 53,2 проц.; па іншых групах насельніцтва сабрана падпіскі на 680.000 руб.—52,3 проц. заданьня.

Ахоп пазыкай яшчэ невыстарчальны, асабліва па сялянскім сэктары. Ёсьць калгасы, у якіх яшчэ не праведзена ніякай работы. Сампрамкаапэрацыя нічога ня робіць для рэалізацыі пазыкі сярод саматужнікаў.

Добра выканалі заданьні Клепчаніцкі раён—177,8 проц., Бешанковіцкі—122 проц. Плятуцца ў хвасьце Пухавіцкі—20,3 проц., Высачанскі—39 проц. Таксама дрэнна стаіць справа з афармленьнем папярэдняй падпіскі. Некаторыя раёны зусім не прадставілі вестак аб афармленьні.

У сувязі з тым, што да 1-га кастрычніка работа па рэалізацыі і афармленьні падпіскі на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» ня скончана, НКФ БССР пастанавіў працягнуць гэтую работу да 15 кастрычніка.

Раёны павольных тэмпаў

Важнейшая дырэктыва партыі і ўраду аб мабілізацыі сродкаў насельніцтва датэтуль не ўсьвядомлена яшчэ ўсімі раённымі і вясковымі арганізацыямі.

Аб гэтым сьведчыць рад фактаў з практыкі Віцебскага і Багушэўскага раёнаў.

Да 1-га кастрычніка трэ' было сабраць ня менш 50 проц. с.-г. падатку. Для гэтага, трэ' было разгарнуць шырокую агітацыйна-растлумачальную кампанію, мабілізаваць грамадзкасьць і г. д. Фактычна па гэтых двух раёнах нічога ня зроблена. Падатак наступае выключна самацёкам. Увынку па Віцебскім раёне на 20 верасьня выканана толькі 28,6 проц. гадовага заданьня, ёсьць сельсаветы, якія выканалі толькі 5-13 проц. заданьня, (Заароцкі, Астровінскі сельсаветы). Па Віцебскім раёне да 23 верасьня павет ня быў яшчэ налічаны падатак на саўгасы.

Сходы па самаабкладаньні павінны былі быць скончаны па ўсіх раёнах да 25 верасьня з тым, каб ужо ў канцы верасьні пачаці паступаць грошы. Між тым па Віцебскім раёне да канца верасьня сходы па самаабкладаньні не праводзіліся. Бабіцкі сельсавет лічыць магчымым пачаць сходы з 3-га кастрычніка, Віцебскі—з 1-га на 15-га, а Большэлічанскі сельсавет лічыць, што раней трэба скончыць зборжазагатоўкі, а потым заняцца самаабкладаньнем.

Ня лепшы малюнак і па Багушэўскім раёне. Бядніцка-сярадзіцкая частка сялянства з вялікай ахвотай прымае самаабкладаньне, ведае адразу ўлёсіць грошы, але з-за нядбайнасьці работнікаў сельсавету, раскладкі адразу ня робяцца. Старшыня Навасельскага сельсавету, напрыклад, хапае ў вішні пратаколы 4-х сходаў і не перадае іх сакратару для таго, каб працівць раскладкі. Леташняя недоімка зусім не спагнаецца, ня кледзячы на тое, што ёсьць шмат плацёжаздольных недоімшчыкаў.

Да 1-га кастрычніка павінна было паступіць ня менш 50 проц. гадавога заданьня па страхоўцы. З-за нядбайнасьці страхавога інспэктара і загадчыка Багушэўскага Райфінаддзелу, адкладныя лісты перададзены плятнікам толькі 17-18 верасьня. І таму на 20 верасьня выканана толькі 22,1 проц. гадавога заданьня. Па Віцебскім раёне лісты перададзены своячасова, але не праведзена ніякай агітацыі за тэрміновую ўплату,—на 20 верасьня паступіла толькі каля 25 проц. заданьня.

Падпіска на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» па гэтых раёнах праходзіць дрэнна, асабліва афармленьне падпіскі. Так, па Віцебскім раёне завод «Ноўка» не афарміў падпіскі на 15.000 руб., раённае спажывецкае таварыства—на 5.750 руб.

У Навасельскім сельсавеце, Багушэўскага раёну, ні адзін калгас не падпісаўся на пазыку. На запытаньне прадстаўніка НКФ, чаму калгас не падпісваецца на пазыку, старшыня калгасу «Садоўнік» А Рыцкі адказаў: «Раней павінны падпісацца адзіначасобнікі і паказаць прыклад калгасам».

Даволі арыгінальна зразумеў Рыцкі ролю калгасаў на вёсцы.

Па Сідорніцкім сельсавеце ні адзін калгаўнік не падпісаўся на пазыку, а між тым яны-ж агітуюць сярод сялян за пазыку. Можна сабе ўявіць якасьць і эфэктыўнасьць гэткай агітацыі!

Зрываецца работа ашчадкас па мабілізацыі сродкаў. Заданьне па віцебскай райкасе выканана толькі на 50 проц. Калі за першую дэкаду верасьня быў хоць некаторы прыліў укладаў—на 960 руб., дык за другую дэкаду верасьня ёсьць адліў у 450 руб. У Багушэўскім раёне раённая каса ашчадкасьці яшчэ не арганізавана, хоць загадчык касы даўно ўжо назначаны і атрымлівае пэнсію. Чым ён займаецца ўвесь час, ня ведае павет прэзыдыум РВК.

Ня выканана пляну мабілізацыі сродкаў і кооперацыя абодных раёнаў. Характэрна заява старшыні спажывецкага таварыства Багушэўскага раёну на пасяджэньні прэзыдыуму РВК, што наш дрэнна зьбіраюцца таму, што няма пажэнных тавараў. Гэты «кааператар» лічыць, што ім можна зьбіраць толькі пры выдачы мануфактуры, або ботаў. Іншых спосабаў ён ня ведае.

Да ўсяго гэтага застаецца дадаць, што па Багушэўскім раёне выяўлены агідныя факты недабракладаньня кулакоў, навядчы іншых калгасам, няправільнага налічэньня падатку калгасьнікам і г. д.

Р-н.

Менскі гарсавет ня выканаў дырэктывы аб мабілізацыі сродкаў

Старшыні і нам. старшыні Менгарсавету абвешчана вымова

Савет Народных Камісараў заслухаў даклады Менскага гарадзкога савету і Багушэўскага райвыканкому аб ходзе мабілізацыі сродкаў.

СНК адзначыў, што па г. Менску няма яшчэ пералому ў мабілізацыі сродкаў. Дрэнна ідзе рэалізацыя пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» (афармлена 57,2 проц. падпіскі). Зусім не паступаюць сродкі па лініі саматужна-прамысловай і жыльлёвай каапэрацыі. Амаль няма ніякага руху ў рабоце ашчадкас. Слаба ідзе паянакапленьне па спажывецкай каапэрацыі.

СНК адзначыў, што Менскі гарсавет слаба кіраваў справай мабілізацыі сродкаў насельніцтва, вакол мабілізацыі не разгорнута масавая работа.

СНК за дрэнную работу па мабілізацыі сродкаў абвясьціў вымову старшыні Менскага гарсавету і яго намесьніку.

Чаркамфіну і Менскаму гарсавету даручана прыцягнуць да адказнасьці тых працаўнікоў фінансава-крэдытных устаноў, якія ня выканалі дырэктыў аб афармленьні падпіскі на пазыку.

Нездавальняюча праходзіць мабілізацыя сродкаў па Багушэўскім раёне, хаця за вялікую пяцідзённую вызначыўся некаторы зрух. Падпіска на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» праведзена толькі на 46,8 проц. Спагнана страхоўкі 39,4 проц. замест 50 проц. гадавога заданьня. Не разгорнута работа па павялічэньні ўкладаў у ашчадных касах.

СНК прызнаў работу Багушэўскага райвыканкому ў галіне мабілізацыі сродкаў нездавальняючай і прапанаваў яму прыняць самыя рашучыя меры да выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў. Р.

Тармозяць ініцыятыву мас

сельсаветы Магілеўскага р-ну

МАГІЛЕЎ (Наш кар.). Рад сельсаветаў раёну зусім не адчувае ніякай адказнасьці за ход мабілізацыі сродкаў. У шмат якіх сельсаветах панурае бязьдзейнасьць.

Якая работа, такія і вынікі. Сарвана заданьне сабраць на раёне да 1-га кастрычніка ня менш 50 проц. страхавых плацяжоў, сабрана 13.380 руб.—10 проц. пляну. Па с.-г. падатку павінна было паступіць ня менш 50 проц., сабрана 40 проц. Хонаўскі сельсавет сабраў толькі 27 проц., Княжыцкі—29, Цішаўскі—31 і г. д. Гэта ў той час, калі само працоўнае насельніцтва прымае пастановы аб поўнай датэрміновай здачы с.-г. падатку. Сельсаветы замест таго, каб мабілізоўваць масы на датэрміновую здачу с.-г. падатку, плятуцца ў хвасьце, замазваюць гэтую ініцыятыву бедняцтва і серадняцтва. Напрыклад, тры вёскі Чырвонапольскага сельсавету пастанавілі поўнасьцю датэрмінова здаць падатак, сельсаветы марудзяць са зборам яго. Княжыцкі сельсавет доўгі час затрымліваў здачу сабраных грошай.

Па раёне датэтуль ёсьць 39 проц. недоімкі на леташнім самаабкладаньні. Сельсаветы нічога ня робяць, каб спагнаць іх.

Зусім кепскае становішча з мабілізацыяй сродкаў на лініі каапэрацыі. Спажывецкая каапэрацыя выканала плян паянакапленьня на 30 проц., а с.-г. каапэрацыя—на 19 проц.

Сыгналаў даволі! Трэба прымусіць сельсаветы зразумець важнасьць гэтай работы і пабальшавіцку ўзяцца за яе выкананьне.

А. ЛЯСНЫ.

Як з'эканоміць мільёны рублёў і дэфіцытныя матар'ялы пры лесаперавозках

(У парадку прапановы)

Разгорнутая індустрыялізацыя краіны патрабуе мабілізацыі ўсіх рэсурсаў для забесьпячэньня капітальнага будаўніцтва.

Патрэбна самая суровая эканомія металу, лесаматар'ялаў, вапны, цэглы, цэменту і г. д.

Між тым, у некаторых арганізацыях дарэмна выдаткоўваюцца сотні кілё каштоўных матар'ялаў.

Возьмем, напрыклад, лесазагатоўкі. Даўно ўжо існуе звычай увязваць усю лесапрадукцыю, якая укладваецца на пляцформах цягнікоў, пэрпягатунцкімі дротам. Для кожнай пляцформы патрабуецца 12 кгр. дроту. Такім чынам у год выдаткоўваюцца соті тон каштоўнага пэрпягатунцкага матар'ялу. Паколькі гэтага дроту не хапае, лесапрадукцыя часта залежваецца на складах, і дзяржава нясе страты.

Задача мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў патрабуе замены дроту іншымі менш каштоўнымі, менш дэфіцытнымі матар'яламі.

Замест дроту для ўвязкі лесаматар'ялу можна сьмела скарыстоўваць друкуючыя перакладкі і лазу.

Увязку можна рабіць наступным чынам: праз кожны рад ці два рады бярвеньня кладуцца перакладкі, якія па канцох перавязваюцца лазой, зьверху пляцформы таксама кладуцца перакладкі.

Гэта замена дае вялікі эканамічны эфэкт. Увязка 3.000 пляцформ дротам абыходзіцца ў 5.280 руб., увязка 3.000 пляцформ лазой з друкуючымі перакладкамі каштуе 600 руб. Такім чынам, па адным Асінавіцкім раёне, дзе трэба адгружаць 3.000 пляцформ у год, дасягаецца эканомія ў 4.600 руб. Па ўсім СССР гэта складае вялікія дадатковыя рэсурсы, якія вельмі патрэбны для індустрыялізацыі краіны.

Якасьць увязкі лесаматар'ялу лазой ні ў якім разе ня ўступае ўвязцы дротам.

Лесазагатоўчыя арганізацыі павінны прыступіць да загатоўкі лазы з мэтай поўнага забесьпячэньня ўвязачным матар'ялам лесазагатовак у 1931 годзе.

Вопыт увязкі матар'ялаў лазой ужо праводзіўся у Асінавіцкім раёне і даў добрыя вынікі.

С. Х. РАМІНСКІ.

Дэклярацыя аргбюро Беларускага Літаратурнага Аб'яднаньня Чырвонай арміі і флёту

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам камуністычнай партыі, Савецкі Саюз будуе сацыялізм. Няўхільна расьце і мацнее СССР, тысячамі новых калгасаў і саўгасаў, гігантаў-заводаў і фабрык, магутных электрастанцый адзначаючы свой шлях і свае перамогі ў сацыялістычным будаўніцтве.

Але-ж над намі вісіць штодзённая небясьпека новай вайны, заўжды можна чакаць новага ўзброенага нападу імпэрыялістых на сацыялістычныя рэспублікі. Гэтую новую сусьветную бойню падпіхваюць выхтуюць капіталісты, каб у крыві мільёнаў працоўных патапіць рэвалюцыйны рух пралетарыяту Захаду і Усходу, каб вынішчыць сацыялістычную бацькаўшчыну працоўных — Савецкі Саюз Сацыялістычных Рэспублік.

Наша задача — быць у сталай гатоўнасьці, каб як належыць спаткаць ворагаў напад, каб адстаяць будаўніцтва сацыялізму, каб новую імпэрыялістычную вайну ператварыць у сусьветную рэвалюцыю.

Рабоча-сялянская Чырвоная армія і флёт, акружаныя любоў'ю і падтрыманьнем працоўных СССР і пралетараў усяго сьвету, пільна сочаць за межамі нашай краіны, гатовыя рушыць у бой па першым закліку Ленінскай партыі і Савецкага ўраду.

Ведаць пра гістарычнае мінулае Чырвонай арміі і флёту, пра іхнія будні базавое напружанае вучобы, ведаць пра тыя адказныя і складаныя задачы, што стаяць перад імі ў будучыні, ведаць пра ўсе захады нашых клясавых ворагаў павінен кожны грамадзянін Савецкага Саюзу, каб тым лепш выканаць свае абавязкі ў справе абароны Савецкага Саюзу.

Мастацкае слова становіць з сябе магутную сілу ў асьвятленьні задач абароны краіны і мабілізацыі пайнага іх пралетарскае грамадзкасьці на практычную працу на ўзмацненьні абароназдольнасьці Саветаў. Мастацкае слова аьяўляецца магутным сродкам выхаваньня і загартаваньня байца-чырвонаармейца, сьвядомага змагара за інтарэсы сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Наш клясавы вораг таксама карыстаецца гэтай зброяй, атручваючы сьвядомасьць рабочых і сялян нацыяналістычным чадам, рознымі хлусьлівымі байкамі пра наш Савецкі Саюз.

Нашае пралетарскае мастацкае слова павінна распаўсюджваць нашу клясавую праўду, абуджаць да змаганьня з клясавымі ворагамі рабочых і сялян, заклясавымі полымям клясавае нянавісьці да сусьветнага імпэрыялізму, заклікаць да інтэрнацыянальнай салідарнасьці і брацтва працоўных усіх нацый і народаў у справе перамогі сусьветнай рэвалюцыі. Пралетарская мастацкая літаратура павінна асьвятляць Чырвоную армію і флёт, якія сваёй крывёю абаранялі і будуць абараняць СССР ва ўзброеным змаганьні.

Але-ж да гэтага часу наша літаратура ня адлюстроўвала так, як гэтага вымагаюць сучаснае становішча і задачы абароны краіны, гераічнага змаганьня Чырвонай арміі, яе будаўніцтва, яе напружанай працы па стварэньні высокакваліфікаванага байца, які дасканала ўладае вайсковаю тэхнікаю, які разумее свае клясавыя і інтэрнацыянальнае задачы ў сацыялістычным будаўніцтве і ў будучых рашучых баёх дзьвюх імпэрыялістычных сіл — пралетарыяту і буржуазіі.

Калі пралетарская літаратура іншых брацкіх савецкіх рэспублік мае ўсё-ж мастацкія творы на такія тэмы, дык пралетарская літаратура БССР зрабіла яшчэ вельмі мала ў справе ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны і ў справе ўзмацненьня ўдзелу ў ім пісьменнікаў і ўсяго пралетарыяту Беларусі.

Мастацкая літаратура, якая ў сваёй сутнасьці ёсьць зброя, ня ўдзельнічала ў ліквідацыі прарыву, ня ўдзельнічала ў ліквідацыі кулацтва, ня ўдзельнічала ў ліквідацыі бандытызму, ня ўдзельнічала ў ліквідацыі нацыянал-дэмакратыі і нацыянал-фашызму, ня ўдзельнічала ў ліквідацыі ўхілаў

ДАКУЛЬ ГНЯЎКО БУДЗЕ ПАНАВАЦЬ

НА БЕРАГОХ РАКІ АРЭСЫ

МЭЛІЯРАЦЫЙНЫЯ РАБОТЫ НА МАР'ІНСКІМ КАЛФОНДЗЕ БЯЗ ТЭХНІЧНАГА КІРАЎНІЦТВА

ПЛЖЭ-СПЭЦ ГНЯЎКО ВЫЖЫВАЕ ПАРТЫЙЦАЎ І СУМЛЕННЫХ РАБОЧЫХ

На абшарах Палесься ідзе гэраічнае маганьне. Тысячы чалавек крок за крокам адваёўваюць новыя кавалкі зямлі з векавога заімшэлага балота.

Мэлярацыйныя работы ў Палессі маюць вялізарнае значэньне. Па сваіх размерах яны займаюць адно з першых месц у сьвеце. **У гэтым годзе на мэлярацыю асигавана каля 7 млн. рублёў. На будучы год запраектавана 30 мільёнаў.**

Як-жа скарыстоўваюцца мільёны, якія адпускае пралетарская дзяржава на ператварэньне палескіх балот у квітнеючыя нівы?

Для прыкладу возьмем гідратэхнічныя работы на берагох ракі Арэсы, найбольш буйныя ў БССР.

Як гэта ня дзіўна, ні палітычнага, ні тэхнічнага кіраўніцтва на Арэскім калфондзе няма. Начальнік калфонду **Трыма** на працягу ўсяго будаўнічага сэзону быў дзе толькі хочаце, але не на калфондзе. Яго намесьнік, тэхнічны кіраўнік **Гняўко** на работах бывае вельмі рэдка, наездамі. У выніку мэлярацыйныя работы на калфондзе ў першым квартале сэзону фактычна сарваны. Машыны сваячасова не былі адрамантаваны і у самы разгар работ на цэлых тысячах стаялі бяз руху (прастой машыны «Марыёнк» кожны тыдзень каштуе каля 5.000 руб.). Часткі машын і іншы інвэнтар, завезены з-за мяжы, валяюцца, ня пакрыты, іржавеюць і гніюць (каўшоны чарнакі, маторная лодка і г. д.).

Служачыя кіраўніцтва калфонду — амаль усе вычышчаныя з савецкага апарату. Тэхнічны кіраўнік Гняўко прымае і звальняе рабочых бяз усякага тлумачэньня з рабочкомам, у выніку на калфонд праляз ці кулакі, падкулачнікі і розныя злачынныя элемэнты. Стаўкі тэхнічнаму персаналу і служачым вызначае самавольна Гняўко, бяз ведама і згоды рабкому.

Паводле распараджэньня Гняўко, прадукты, якія былі загатоўлены для рабочых, раздавалі служачым. Так, за месяц было выдана: сала служачым 34,5 кілё, рабочым — 10,6 кілё; мукі пшанічнай — служачым 60 кілё, **рабочым—ні аднаго;** круп служачым 25 кілё, **рабочым—ні аднаго;** цукру—служачым — 35 кілё, **рабочым — 1,2 кілё;** селядцоў — служачым — 3,65 кілё, рабочым — 0,8 кілё.

Тэхнічны кіраўнік Гняўко аб усіх гэтых адмоўных зьявішчах на калфондзе забараняе гаварыць. Таго, хто адважваецца яму супярэчыць, ён адразу запалохвае звальненьнем і вымовамі.

— Не магу працаваць, — кажа Гняўко, — калі рабочыя мяне кантролююць, а яшчэ горш, калі крытыкуюць маю работу на агульных сходах.

З прычыны запіску самакрытыкі, шмат рабочых і служачых накінулі ўжо калфонд. Партыйцаў, якія прыбываюць туды на работу, Гняўко ўсімі спробамі імкнецца выжыць.

Для поўнай характарыстыкі становішча на калфондзе дадамо, што Гняўко былы афіцэр, які ня мае ніякай тэхнічнай адукацыі, а займае пасаду тэхнічнага кіраўніка і атрымлівае 550 руб. у месяц.

Пара ўжо пакласьці канец панаваньню Гняўко на берагох ракі Арэсы. Пралетарская грамадзкасьць патрабуе, каб тыя мільёны, якія адпускае дзяржава на мэлярацыйныя работы, скарыстоўваліся належным чынам.

Рабочая брыгада:
САМОЦІН, МАЛАШЭНКА, ГРЫНЬКО.

Недаацэнка мэлярацыйных работ

У якім становішчы знаходзіцца зараз мэлярацыйнае будаўніцтва?

На гэта пытаньне дае адказ пастанова калегіі НКЗ на дакладзе аб ходзе мэлярацыйнага будаўніцтва.

Калегія сьцвердзіла пагрозу выкананьню плянаў работ — дагэтуль выканана 28 проц. пляну.

Тэмпы работы на больш важных вучастках пагражаючыя. Такое становішча мэлярацыйнага будаўніцтва зьяўляецца вынікам недаацэнкі гэтай работы з боку некаторых масцовых арганізацый — партыйных, прафесыянальных, РВК і сельсаветаў.

Ніякай растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў, батракоў, бедняко ў і серадняко ў аб задачах мэлярацыі, аб метах гэтай работы не праводзіцца.

Прафесыянальныя арганізацыі не зварачаюць увагі культурна-масавай рабоце сярод сэзоннікаў, занятых на мэлярацыйных работах. Сацсаборніцтва не разгорнута. Каапэрацыйныя органы злачынна-нядбайна забясьпечваюць рабочых. Так, на працягу двух дзён не дастаўляўся хлеб на Арэскі калфонд. Органы працы ня толькі не дапамагаюць вярбоўцы рабочых на мэлярацыйныя работы, але наадварот пераманьваюць рабочых (Брагінскі калфонд).

Ня гледзячы на тое, што ўмовы мэлярацыйных работ вельмі цяжкія, нормы харчаваньня рабочых, занятых на мэлярацыі, ніжэй за нормы па торфарасарацыі, рабочых, якое праводзіцца на іншых работах, па мэльфондах ня ўжываецца.

Савецкая грамадзкасьць павінна сказаць сваё слова аб становішчы мэлярацыйных работ.

М. С.

Прасьледвальнікаў рабкора Гарэцкага--да суровай адказнасьці

Бабруйскі „Камуніст" не падтрымаў рабкора--актывістага

У 1925 годзе дэмабілізаваны чырвонаармеец тав. **Гарэцкі** быў абраны сакратаром Янаўскага сельсавету, Сьвіслацкага раёну.

Школа Чырвонай армії зрабіла з т. Гарэцкага рашучага змагара за інтарэсы працоўных, энэргічнага актывістага.

Трапіўшы ў Янаўскі сельсавет, ён адразу-ж пачаў змагацца з кулацтвам. З неатлучнымі ўчынкамі членаў сельсавету, выкрыў сувязь некаторых сельсаветчыкаў з кулакамі, п'янства старшыні РВК Пяроўскага і г. д.

Ячмя ў 1925 годзе ён пачаў пісаць заметкі ў бабруйскую газэту «Камуніст», заметкі ўсім лёзам пакіраваныя супроць тых чужых людзей, якія трапілі ў мясцовыя органы.

Старшыня Сьвіслацкага РВК **Пяроўскі** доўгі час шукаў прычыны, каб прыдрацца да Гарэцкага, адпомсьціць яму за заметкі ў газэце. Не знайшоўшы ніякіх фактаў, Пяроўскі скарыстаў чуткі аб тым, што Гарэцкі нібыта браў хабары, што ён няправільна разьмеркаваў лес, мае тагo, каб яго зволіць з пасады сакратара сельсавету і вынець з работы жонку Гарэцкага—настаўніцу ў Сьвіслацкім раёне.

Рэдакцыя «Савецкай Беларусі» ў 1929 годзе ўзьняла пытаньне аб цкаваньні Гарэцкага і яго жонкі. Гарэцкага адпачылі на рабоце і заплацілі каля 700 руб. за вымушаны прагул.

У 1929 г. Гарэцкі паступае на работу на гуту «Кастрычнік». Сакратар Сьвіслацкага РК КП(б)Б перасылае, пазуёна, па дамаганьні Пятроўскага і іншых, кампрамэтуючыя Гарэцкага матар'ялы, быццам, ён кулак, чужы элемэнт і г. д. (Гарэцкі—сын бедняка, бацька яго ня плаціць падатку). Дырэктар заводу Кісялеўскі і сакратар партканкэтыву Пінкевіч з прыемнасьцю скарыстоўваюць прысланыя матар'ялы—ім Гарэцкі таксама «пасаліў», выкрываючы рад фактаў бесгаспадарчасьці і іншых непаладак на заводзе. Гарэцкага звальняюць з работы за «грубыя адносіны» да рабочых, хаця рабочыя рашуча патрабавалі яго аднаўленьня.

Гарэцкі скардзіцца ў Бабруйскую Інспэкцыю працы, у НК-РСІ, у ЦП саюзу хэмікаў, пракурору па працоўных справах. З-за бюдурныя бюракратычных адносін некаторых работнікаў гэтых усталёў справа доўгі час марыцуецца. Гарэцкі ніяк ня можа дабіцца сваёй рэабілітацыі.

Толькі зараз выявілася, што Гарэцкі не вінаваты. Хутка вінаватыя ў цкаваньні рабкора прадстануць перад судом.

Як адносіцца да гэтае справы рэдакцыя газэты «Камуніст»? Яна, не ўваходзячы ў сутнасьць справы, апраўмавала свайго актыўнага рабкора і, не праверыўшы фактаў, выключыла яго з радоў рабселькораў. Нават зараз, калі сьледзтва выявіла калупасьць агіднага цкаваньня рабкора, «Камуніст» ця хоча прызнацца ў сваёй сьлепаце і выправіць памылку.

Справа Гарэцкага павінна прыцягнуць увагу ўсёй нашай грамадзкасьці. Суд над прасьледвальнікамі павінен паслужыць урокам для ўсіх тых, хто прасьледуе самакрытыку, хто, парушаючы дырэктывы і пастановы партыйных органаў, падрывае рабселькораўскі рух—магутную зброю савецка-партыйнага друку.

А. МАНЬКОЎ.

МЕНСК

Пуск Асінбуду—8 лістапада

Урачысты пуск Асінбуду імя Сталіна прызначаны Урадавай камісіяй на 8 лістапада. У сетку Асінбуду 8-га лістапада будуць уключаны падстанцыі ў Віцебску, Магілеве, Воршы, Дубровне і г. Барані.

На ўрачыстасьць запрашаюцца прадстаўніні фабрык, заводаў, калгасаў, а таксама саюзных рэспублік.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦСПСБ

— МЦРК перадаў ЦСПСБ праект скарачэньня **тэрміну выплаты каапэрацыйнага пая.** Гэта прапанова будзе абгаворана на сходах рабочых буйных прадпрыемстваў.

* * *

— Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў **скарыстаць клюб саюзу Нархарч** пад школу прафруху. Даручана культсэктару ЦСПСБ разам з ЦК саюзу Нархарч, камунальнікаў і Мэдсанпрацы выпрацаваць практычныя мерапрыемствы па культурным абслугоўваньні членаў саюзу Нархарч.

* * *

— Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў **правесьці аб'сьледваньне работы ЦП саюзу Мэдсанпрацы,** у сувязі з заметкай у газэце «Труд» «Куда идет ЦП союза Медсантруд».

Даручана арганізатарскаму сэктару ЦСПСБ распрацаваць праграму абсьледваньня і выдучыць брыгады для ўдзелу ў гэтай рабоце.

* * *

— Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў **каптаваць т. Домброўскага** ў склад членаў прэзыдыуму ЦСПСБ.

СПРАВАЧНІК МЦРК

— МЦРК пачынае адпускаць прадукты дыетычнага харчаваньня хворым (па рацэптах) выключна з крам № 11 (Камароўка), № 216 (Маскоўская вул.) і № 25—(рог Савецкай і Камсамольскай).

* * *

— Усе талёны на дэфіцытныя тавары, выданыя МЦРК тэрмінам да 5 кастрычніка, сапраўдны да 15 кастрычніка.

* * *

— МЦРК пачаў адпускаць пайшчыкам на паборных кніжках без талёнаў палітэ (пазімовыя) з грубай шэрсьці.

«СПОРТ»

— ВСФКВ паслаў 8 былых акруговых работнікаў фізкультуры ў раёны БССР для практычнай дапамогі ў рабоце фізкультурных арганізацый і для арганізацыі раённых саветаў фізкультуры.

* * *

— 30 верасьня ў Маскве скончыліся **ўсесаюзныя прафсаюзныя спаборніцтвы па цяжкай атлетыцы.** Першае месца заняў рабочы менскай абутковай фабрыкі т. **Лапідус,** які паставіў два ўсесаюзных рэкорды па цяжкай атлетыцы. (Рывок левай рукой—52,65 кілёгр., штурханьне двюма рукамі—80,6 кілёгр.).

* * *

— 12 кастрычніка адбудзецца **ўсесаюзны мітынг фізкультурнікаў** на радыё па пытаньні ўдзелу фізкультурнікаў у надрыхтоўцы да 9-га зьезду УсеЛКСМ. У Менску адбудзецца агульна-гарадзкі сход фізкультурнікаў для калектыўнага слуханьня мітынгу.

Вечар соі

Гэтымі днямі санітарна-гігіенічны інстытут камандыраваў у Маскву доктара за соій. Маскоўскі інстытут соі адпусьціў Беларускаму інстытуту санітары і гігіены на навукова-дасьледчыя мэты 20 кілёграм соі, якая дастаўлена ў Менск. Прывезена таксама літаратура і рэцэптура 120 страў з соі. Інстытут рыхтуе даклад аб соі ў навуковай асацыяцыі дактароў і вечар папулярызацыі і дэгустацыі соі.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЕНЬНЯ, 6-га КАСТРЫЧНІКА

— **Дом Асьветы.** А 7 г. увеч. адбудз. адкрыты сход цэх. ячэйкі дашкольных устаноў. У парадку дня: справаздача групкому № 7. Запраш. дашкольніцы.

— **Дом Асьветы.** А 7 г. увеч. адбудз. адкрыты сход цэх. ячэйкі КП(б)Б школьных устаноў. У парадку дня: справаздача групкому № 4.

Прысутнасьць партыйцаў і камсамольцаў абавязкова. Запраш. асьветнікі.

— **Дом Пісьменьніка.** А 7 г. увеч. адбудзецца працяг сходу менскай філіі БелАПП. На парадку дня—абгаварэньне творчых пытаньняў. Перад сходам а 6 г. адбудз. пасяджэньне бюро філіі. Уваход вольны. Просьба да ўсіх членаў БелАПП'у зьявіцца на сход своячасова.

— **Клюб імя Леніна.** А 6 г. увеч. адбудз. арганізацыйнае пасяджэньне чыгуначнага вучастковага культштабу, на якое павінны зьявіцца вылучаныя прадстаўнікі ў культштаб ад наступных прадпрыемстваў і ўстаноў: ад мясцкому грузчыкаў т. Ціхановіч, зав. «Адраджэньне» («Ударнік») — т. Перальман, ф-ка «Акцябр»—т. Даух, жакт № 19—т. Богдан, больніца МБВ ч.—т. Эпціна, мясцком № 3 (став. станцыя)—т. Лагацкі, МК № 2, шчотачная ф-ка, жакт № 11, жакт № 20, завод «Полымя Рэвалюцыі»—т. Дзябана, малочны завод—т. Сільноў, саўгас «Чырвоны Транспартнік»—т. Аршакян, саўгас «Курасоўшчына», гута «Пралетары»—т. Кацнэльсон, фармзавод—т. Леапові, групк. № 16 пры МБВ ч.—т. Васкабойнік, цагельні №№ 1, 2-4 1-3, 3, 8, Менбуд—т. Лапелеў, рабфак Дому Ураду і БДУ (старшыня), нафтазавод, групком нархарч №№ 6, 4, 2, 1, 36 сямігодка—т. Чарнагорцава, 33 сямігодка—т. Буткевіч, 3 сямігодка—т. Барсукова, сямігодка імя Чарвякова—т. Сукуранка, 7 сямігодка—т. Юрэвіч і Нямкевіч. Яўка абавязкова.

ЗАЎТРА, 7-га КАСТРЫЧНІКА

— **Дом Асьветы.** А 8 г. увеч. адбудз. нарада адказных сакратароў і членаў групкому, МК і прафкомаў саюзу Працасьветы. На парадку дня: 1. Аб зьлёце ўдарнікаў; 2. Даклад Дому Асьветы аб культурна-масавай рабоце. Яўка абавязкова.

— А 8 з пал. гадз. увеч. у дзіцячай клініцы адбудзецца пасяджэньне гэранэўтычнай секцыі Навуковай Асацыяцыі. Парадак дня: 1) Дэманстрацыя хворых. 2) Сымптом урчаньня ў сыгмавідзнай кішцы ў дынгностыцы захаваных форм і стадый энтэрытаў. 3) Бягучыя справы.

— **Фрунзаўскі РК ЛК(б)Б.** Прыём у ВСШП пачынаецца а 5 па 10 кастрычніка. Усе т. т., якія запісаліся, павінны зьявіцца а 7 г. увеч у памяшк. 2-й сямігодкі (Ленінская вул., супроць пошты). Адказнасьць за яўку ўскладаецца на сакратароў парт'ячэек. Таксама павінны зьявіцца т.т., якія скончылі 1-шы курс.

— **Бюро скаргаў НК РСІ БССР.** З мэтай пастаяннага ўліку добраахвотнікаў, прымацаваных і працуючых пры Цэнтральным аб'яднаным бюро скаргаў НК РСІ БССР, а таксама з мэтай павялічэньня і большага прыцягненьня ў працу бюро скаргаў добраахвотнікаў (лёгкіх кавалерыстых, далегатаў, рабочых, служачых і студэнтаў—членаў сэкцый Менгарсавету), бюро скаргаў НК РСІ а 5 па 20 кастрычніка праводзіцца перарэгістрацыя наміненага актыву і запіс новых добраахвотнікаў, што жадаюць працаваць у бюро скаргаў. Перарэгістрацыя праводзіцца штодзенна з 9 да 4 гадз. і з 6 да 8 гадз.—1, 3, 7, 10 і 13 кастрычніка. Акрамя таго, бюро скаргаў просіць ФЗМК і парт'ячэйкі даручыць аднаму з адказных партыйных таварышоў правесьці запіс новых добраахвотнікаў, жадаючых працаваць пры бюро скаргаў. А таксама бюро скаргаў просіць сваіх рабочых-засядацеляў прыняць актыўны ўдзел у рабоце на вярбоўцы.

— О 5-га па **10-е кастрычніка** ў памяшк. ЦП саюзу Працасьветы пачынаецца **перавучэньне усіх беспрацоўных членаў саюзу Працасьветы.** Перадак перавучэньня наступны: 5-га—А, Б, В, Г, 6-га—Д, Е, Ж, З, І, 7-га—К, Л, М, Н, 8-га—О, П, Р, С, 9-га—Т, У, Ф, Х, Ц, 10-га—Ч, Ш, Э, Ю, Я. Зьявіўшыяся на перавучэньне павінны мець на руках дакументы: членскі білет, біржавы талён, пасьледняе апошняга месца працы і пастаянную каапэрац. кніжку. Яўка ўсіх беспрацоўных абавязкова, не зьявіўшыяся будуць зьняты з вучоту.

ПАПРАЎКА

Ва ўчарашнім нумары «Зьвязды», на трэцяй старонцы ў артыкуле «Ударныя тэмпы» на тэхнічным подагладзе выпаў подпіс аўтара артыкулу—Ліманоўскі.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара
А. МІТЛІН.

Сёньня, 6-га кастрычніка адбудзецца **КАНФЭРЭНЦЫЯ ЎДАРНІКАЎ РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ ФРУНЗАЎСКАГА РАЁНУ.**

Парадак дня: 1. Даклад аб палітычна-гаспадарчых задачах 3-га году пяцігодкі. 2. Інфармацыі з месц наступ. калектываў: «Кастрычнік», «Камунар», Зав. «ДА», Беддзяржбуд, «Беларуская», друкарня імя Сталіна, Нархарч, саўгас «Лекерт».

Модус прадстаўніцтва 1 ад 8 чал. раб. моладзі.

Канфэрэнцыя адбудзецца ў памяшк. Дому Працасьветы (Камуністычная вул.).

Мандаты ў ФРК з 3/X з 11—3 г. і з 5—7 г.
Пачатак а 6 гадз. увеч.

ФРК ЛКСМБ і ЦСПСБ.

ПУШКІНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА. З 1-га кастрычніка да 1-га лістапада г. г. праводзіцца **ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ ПУШКІНСКАЯ БІБЛІЯТЭКІ** і ва філіялах. Чытачы, якія не перарэгіструюцца ў працягу гэтага тэрміну, будуць лічыцца выбылымі і накінутыя залогі пойдуць у карысьць бібліятэкі, а затрыманыя імі кнігі будуць спагнаны праз народны суд. Пры перарэгістрацыі патрэбна прад'явіць дакумант з паказаньнем хатняга адрасу. Платнасьць у бібліятэках палітасьветы скасавана.

ФРУНЗАЎСКІ І КАСТРЫЧНІЦКІ РК МОПР'у
скліканюць
АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІЯ ГРУПАВЫЯ НАРАДЫ АКТЫВУ ЯЧЭЕК МОПР'у
У НАСТУПНЫМ ПАРАДКУ:

ПАНЯДЗЕЛАК, 6-га КАСТРЫЧНІКА	САВЕЦКІЯ ЯЧЭЙКІ.
АУТОРАК, 7-га КАСТРЫЧНІКА	ВАЙСКОВЫЯ ЯЧЭЙКІ.
СЕРАДА, 8-га КАСТРЫЧНІКА	ФАБРЫЧНА-ЗАВОДЗКІЯ ЯЧЭЙКІ.

Нарады адбудуцца ў памяшк. ЦК МОПР'у
Пачатак роўна а 7 годз. увечары.
Яўка для ўсіх членаў Бюро ячэек і Рэв. кам.- абавязкова.

7-га кастрычніка а 8-ай гадзіне ўвечары ў залі ЦК адбудзецца
АГУЛЬНЫ СХОД членаў усіх марксыцкіх таварыстваў,
З ПАРАДКАМ ДНЯ:
„Задачы таварыства марксыстых на данным этапе сацыялістычнага будаўніцтва".
Пасьля агульнага сходу, установчыя сходы для арганізацыі марксыцкіх таварыстваў, аграрнікаў, дзяржаўнікаў, пэдалёга-пэдагогаў і марксыстых літаратуразнаўцаў.
Культпроп ЦК КП(б)Б.

Мастацкі **ЦЫРК** Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА
Панядзелак, 6 кастрычніка
МАСТАЦКА-ПАКАЗАЛЬНЫЯ ЗРЭЛІШЧЫ
Гастролі рэкордных паветраных гімнастаў 2 пішчанскіх
Універсальных артыстых 5 ЮРАВЫХ Бытавыя музычныя тачыльшчыкі
Лепшы ілюзіяніст З. РАНЦЭЦІ. | Музычныя клёўны РЫМ-РОМ.
Гладыятары 4 ЦАППА | Муштроўшчык галубоў і коні КІСО
і шмат іншых нумароў.
— Пачатак а 8 з пал. г. увеч. —
Адказны кіраўнік І. Л. СТРАШЭВІЧ.
Анонс: Гэтымі днямі сусьветная сэнсацыя ОРНАЛЬДО.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"
З панядзелка, 6 кастрычніка
Новы фільм вытворчасьці «СОВКИНО»
ЗМОВА МЁРТВЫХ
Рэжысэр Шімашэнка.
У гал. ролях: Б. БАБАЧКІН, Л. КМІТ і П. ВІЦІНСКІ.
ШТОДЗЕННА 2 СЭАНСЫ.
Пачатак 1-га сэансу а 2 г. дня, 2-га—3 г. 30 м.
Каса адкрыта ад 12 гадз. дня.

КІНО „СПАРТАК" 3 панядзелка, 6 кастрычніка
БАЯВІК БАЯВІК
БЭЛА
па раману Лермантава. Драма ў 8 частках
У гал. ролях Б. Бяпецкая, Н. Празароўскі
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. увеч., 2-га—9 г., 3-га—10 ч. 45 м.
Каса—з 6 гадз. увеч.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ
У ЧАЧЭРСКУЮ СЬВІНАГАДОЎЧУЮ ПРАФШКОЛУ
(з 1-га студзеня будзе тэхнікум) на групу рабочых, батракоў, а таксама сялян-бедняко ў і калгасьнікаў пралягнуг
ДА 10-га КАСТРЫЧНІКА.
Да заявы патрэбна далучыць: пасьведчаньне аб скавчэньні 7-годзі, анкету і ўсе неабходныя дакумэнты, згодна даведніка НК асьветы.
Частка студэнтаў забясьпечваецца стыпэндыяй і інтэрнатам.
Тэрмін навучаньня—2 з палов. гады.
АДРАС: Чачэрск, Прафтэхшкола.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА" АД ПАНЯДЗЕЛКА, 6 КАСТРЫЧНІКА
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
ЧУЖЫ БЕРАГ
Рэжысэр Мары Данской. У галоўн. ролях: Я. Гуднін, Л. Сямёнава, Е. Гаўрылава, Б. Шліхінг.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
НАША ЗЬМЕНА
Эпізоды з жыцьця піянэр, лагераў; вытворч. Белдзяржкіно
Каса адчынена ад 5 гадз.
Пачатак сэансаў а 7 г., 8 40, 10 20
Тыя, што спазьніліся на 15 мінут, у залю не дапускаюцца.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"
Сёньня і штодзенна
Новы амэрыканскі фільм вытворчасьці П. Д. Ц.
Сцэнары Э. КЛАЎСОН паводле павэлі Д. КОЛІНСА «Сантымэнтальны»
КАПІТАН ЛЯТАЮЧАЙ ЧАРАПАХІ.
(БЭЛЬ з СІНГАПУРА).
У гал. рол. Алан Хэль і Філіс Хэвэр.
Штодзенна 4 сэансы.
ПАЧАТАК 1-га с.—а 6 г., 2-га—7 г. 30 м., 3-га—9 г., 4-га—10 г. 30 м.
Каса адкрыта з 4 гадз. — Спазьніўшыяся на 15 мінут у залю не дапускаюцца.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Ад панядзелка, 5 кастрычніка
новы мастацкі фільм вытворчасьці «Азгоскино»
ГАДЖЫ-КАРА (Соно)
Паводле вядомае п'есы—М. Ф. Ахундова — Рэжысэр—А. М. Шарыфаў.
Звыш праграмы кіно-хроніка
„НАШ АДКАЗ ПАПАМ РЫМСКІМ"
Штодзенна 4 сэансы: пачатак 1-га сэансу а 6 гадз.
КАСА—АД 5 ГАДЗ.

З 10 КАСТРЫЧНІКА ПАЧЫНАЕЦЦА
выдача талёнаў ПА ПАПЯРЭДНЯЙ ПАДПІСЦЫ
ў наступным парадку:
З 10-Х—саюзы мэталістых, чытувачнікаў.
» 11-Х—вайсковыя часьці, буйаўнікі.
» 12-Х—саюзы тарбароў, камунальнікаў і мэдсанпрацы.
» 13-Х—Нарсуньзь, нархарч, друкары.
» 14-Х—хаўчавікі, саўгандальслужачыя.
» 15-Х—працмастацтва, прапасьветы
» 16-Х—рабфамлес, транспартнікі.
» 17-Х—тэкстыльшчыкі, хімікі.
» 18-Х—шэйпром, арцелі.
Зьявіцца з разьверсткай і ведамасьцю падпісі, а таксама квітанцыямі аб узносе грошай.
Працяленьне ТУРК.

ЗАНЯТКІ НА КУРСАХ АРУ
набору 1930-31 г.
ПАЧЫНАЮЦЦА 7-га КАСТРЫЧНІКА
а 7 гадз. у памяшк. курсаў (Ленінская, 2-ая шк., супроць пошты).

Гомельскі тэхнікум саматужнай прамысловасьці
З АДДЗЯЛЕНЬНЯМІ: 1. Дрэваапрацоўчым.
2. Керамічным.
3. Металяапрацоўчым.
Прыём заяў у адчыняемы тэхнікум вытвараецца да 12 кастрычніка ў канцылярыі школы, Ветраная № 50.

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ" прымаюцца да 2 гадз. дня.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА КАМІТЭТУ ЎЗАЕМАДАПАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў,
АДКРЫТА ад 9 гадз. дня. да 9 г. вечара
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
на ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўнікіх, нервовых.
Электра-ольвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 6 г. да 8 г. увеч.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. вечара штодзенна
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях на папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на дому ва ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 8 гадз. вечара.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту
Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную дыфэрэнцыяваную плату.

Для работы ў раённых канторах „Белмяса"
патрабуюцца ў ад'езд БУХГАЛЬТАРЫ І РАХУНКАВОДЫ
АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ
Зварачацца: Белмяса, пляц Воді, № 7, тэлефон № 1387

ПАТРЭБНА пішучая машынка
Савецкая, 63, 3-ці паверх, гал. кантора газ. «Зьвязда»

МЯНЯЮ КВАТЭРУ
з 2-х пакоў у Магілеве ў цэнтры гораду на кватэру ў Менску. Даведацца па адрасе: Універсытэцкая, 27, Камвуэ, студэнту 1-га курсу Кручкову.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА" звяраце па тел. 2-49

Для здачы ПЕВЕСТНІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА" звяраце па тел. 7-81

Кошт публікацыі 50 к. аб згубе 1 дакумэнту

ВЗЛЁСЫПЭД—ПРАЦОЎНЫМ!
КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАСАМІ БССР
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ПРАЦОЎНЫХ, ШТО РЭАЛІЗАЦЫЯ
ВЗЛЁАБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ
1 і 2 сэрыі скончылася
АПОШНІ набыцьця взлёабавязацельстваў 3-й і 4-й сэрыі
ТЭРМІН 15-га КАСТРЫЧНІКА
Кошт взлёсыпэда 3-й сэрыі 151 руб. 50 к. і 4-й—150 р.
Узносы ўносяцца падпісчыкамі роўнымі месячнымі, паўмесячнымі або квартальнымі ўзносамі да наступленьня тэрміну абвяшчэньня.
ПА ЖАДАНЬНІ РАБОТНІЦ ВЫПУШЧАНЫ АБАЯЗАЦЕЛЬСТВЫ НА ЖАНОЧЫЯ ВЗЛЁСЫПЭДЫ
10 проц. 4-й сэрыі—13 тыс. взлёсыпэдаў—працоўным жанчынам.
Кіраўніцтва ашчадкасамі БССР.
Узмацняйце нашу взлёпрамысловасьць! Набывайце ў ашчадкасах взлёабавязацельствы!

Згубленыя і ўкрадзеныя дакументы

лічыць несапраўднымі

Метр. вып. Сяньковіча А. С., выд. Грычынск. сельсаветам 2251
Пашп. Чартовай Л. Н., выд. Мен. міліцыяй 2252
Лек. кн. Фрэйдмана Ш. Х., выд. страхкасай Менсанпрамсаюзу 2253
Пашп. Чартова І., выд. Мен. міліцыяй 2254
Камсам. біл. № 7878 Гарбачова В. Я., выд. Койдан. РК ЛКСМБ 2255
Чл. біл. саюзу мэталістых, 2 разьлік. кн., выд. зав. «Электраэнергія», пашп., выд. Ленінгр. міліцыяй на імя Малец О. А. 2256-2258
Чл. біл. саюзу мэталістых Барана М. Г. 2259
Акл. ліст па с.-г. палатку на 1930-31 год, наведамл. Рэчыцкай падатк. кам. аб с.-г. падатку на імя Сыча А. Ф. 2260-2261
Вайск. пасьведч. № 125 Есьмана А. К., выд. Мен. ваенкаматам 2262
Мэтр. вып. Есьмана Г. А., выд. Пятроўск. сельсаветам 2263
Метр. вып. Есьман В. А., выд. Пятроўск. сельсаветам 2264
Асабов. кн. і вуч. конск. карт. Суботка П. А., выд. Астр.-Гарадз. РВК 2265-2266
Студ. пасьведч. Дубовіка В. А., выд. Горацк. рабфакам 2267
Парт. біл. Самсончык Е. М., выд. Бярэзін. РК КП(б)Б 2268
Парт. біл. № 1302744, выд. Фрунз. РК КП(б)Б, пасьведч., выд. Мен. рабфакам БДУ Ражнова М. Ф. 2269-2270
Чл. біл. саюзу горнарабочых, мэтр. пасьведч., выд. Самахвал. міліцыяй на імя Барысенка А. С. 2271-2272
Мандат № 585, выд. НКЗ БССР на імя Ўсьцінава М. Д. 2273
Асабов. пасьведч. Шугаева Я. П., выд. Іванькаўск. РВК 2274
Даведка на імя Шугаева І. Я., выд. Мен. ЗАГС'ам 2275
Чл. біл. саюзу хэмікаў № 286970, мэтр. вып., выд. Клічаўск. РВК Счысьленак Д. І. 2276-2277
Пасьведч. № 126346 Кажушка М. С., выд. Самахвал. РК ЛКСМБ 2278
Вайск. біл., выд. Мен. ваенкаматам, чл. біл. саюзу чыгунач. № 17577, асабов. пасьведч., выд. к-рай № 2 МБВ ч. на імя Пінчука Д. В. 2279-2281
Біл. курсанта аўташколы Панкевіча М. І., выд. аўташкола № 48 2282
Кніг. аб уплаце пая 2 руб. Вятчык па А. М., выд. Арцелем. ПРК 228
Лек. кн., выд. Мен. страхкасай, на касы ўзаемаданам., выд. 2-м ГК будзі нікоў на імя Анзенгамера М. М. 228
Чл. біл. саюзу МСП Шчобрэвай В. І. 228
Лек. кн., вайск. кн., выд. Аляр.-Гарад. РВК на імя Иучмеля Р. Н. 2286-22

Друкарня газ. «Зьвязда», Менск.